

Мікола Калядны

# Судуманьне



## Мікола Калядны

# СУДУМАНЬНЕ

Аповесць

Мінск
«Галіяфы»
2018

УДК 821.161.3-31
ББК 84(4Беи)-44
К17

**Калядны, М.**

К17 Судуманьне : аповесць / Мікола Калядны. – Мінск : Галіяфы, 2018. – 132 с.

ISBN 978-985-7140-95-4.

Напісаная лексікай без мужчынскага і жаноцкага роду ў адзіночным ліку, аповесць малюе дзіўныя ўзаемадачыненні і касмічныя прыгоды разумных істотаў, паказвае цікавы фенаменальны свет бясплоцевых стварэнняў.

**УДК 821.161.1-31**
**ББК 84(4Беи)-44**

**ISBN 978-985-7140-95-4**

© Калядны М., 2018
© Дарохін П., вокладка, 2018
© Афармленне. ПВУП «Галіяфы», 2018

# 1

Я тут упершыню. Столькі кіраваць міма, раскідваць усякава думкі і ніколі не зачапіцца за гэтыя дрэвы, кветы, не акружыцца ў захапленьні! Шкада. Недаравальна.

Вось заўсёды так: жывеш упэўнена, зьмястоўна, памысна, прагнеш лепшага і дзякуеш за дадзенае — увогуле радуесься быцьцю…

І раптам — такія… Павевы, шэпты, спомігі?..

Нейкія імпульсы атачаюць, вабяць, клічуць, надзяць…

Неадчэпна, настойліва…

Запыняюць, прымушаюць…

Штосьці павінна здацца…

Выпадковасьцям ня веру. Упэўнены: усё рыхтуецца загадзя. Мною альбо кімсьці. Хвілінамі, гадзінамі, днямі, месяцамі, гадамі, стагодзьдзямі й г. д. аж да бясконцых касмасовых кругоў.

У абставінах, што раптоўна адчыніліся, я пакуль не кумекаю і не празіраю. Сьпяшацца нельга. Падумаю і дайду апасьля.

Цяпер мяне перапаўняюць адчуваньні. Няўзмогу панадлівыя. Настолькі знаёмыя і блізкія, што да дрыжыкаў прыемна й салодасна. Аж зглынаю патроху.

Пэўна, раньш я ведаў іх. Калі?

Ня буду мучыцца і ўспамінаць. Заяліла. Набліжуся.

Пасылы зьмяняюцца. Адны мацнеюць, іншыя слабеюць. Нейкія зьнікаюць ды зьяўляюцца. Многімі выпадкамі — фармалізуюцца-трансфармуюцца. Пэўна, я ўплываю на іх. Цікава, яны былі-драмалі заўсёды тут самі па сабе, а я іх раскатурхваю, альбо ўзьніклі ад маіх думкаў? Ці заўважае іх яшчэ хто? Мо толькі я адно?

Зноў унікаю — а гэта цяпер не патрэбна.

Зараз лепш аддацца почавам, чымся развагам, — так натуральней і спаручней.

Атрымліваецца: хоць і захоплівае няспыннае паўсядзённае мітусеньне, я ўсё-ткі не забываю звыкла-гаючых узьдзеяньняў прыродных зьяваў і пры нагодзе адразу ўнутрана скаланаюся, зачароўваюся вакольлем, удыхаю прыемныя пахі. Тут жа набягаюць асацыяцыі, успамінаюцца дзіцячыя ўражаньні, і я зноўку крыху ўшчуваю сябе за многія празьмерна сумятлівыя і няўважныя імгненьні.

Чуткія хрыбеткі здрыганулiся і трохі казытнулі.

Цікава, як у такіх выпадках рэагуюць іншыя мутакі? Як адгукаюцца на розныя нечаканасьці

іхныя хрыбетніцы, асабліва азадзьдзі, купрыкі, хвосьці — часьці цела, злучаныя зь яшчэ наяўнымі рудымэнтарнымі інтымнымі прыемнасьцямі?

Вось і я, махаючы хвосьцем, азіраюся, каб мяне ня згледзелі.

Нікога нямашака. Дый не адчуваю. Значыцца, усё тут толькі маё і можна крышку аслабіцца.

Ад дрыгністых пазванкоў адышло напружаньне, і яны выпусьцілі, накшталт веерных пёраў, празрыстае каляровае адросьце зь пяшчотнымі ніткамі-шчупальцамі, якія адразу захісталіся ў розныя бакі, шукаючы ўцешнага спажываньня.

Тут жа нешта мільганула і прапала, як хуткае птушаня. Фізычна? Эмацыйна? Разумоўна? Адразу ня вызначу, бо палажэньне яшчэ не забрала цалкам.

Паглыбляюся.

Пакрысе праступаюць сьцені. Спачатку ледзьледзь, а потым усё больш відома і напорыста мільгацяць. Іх многа, разнастайныя, уражлівыя, ад прыемных да брыдкіх як вонкава, так і на пахі, гукі, учынкі.

Гуляюцца, мяне пакуль не чапаюць, нібыта прыглядаюцца.

Хай сабе, не ўпершыню. Ведаю і ўмею рэагаваць-разьбірацца. Вось толькі валтузіцца зь імі зашмат. А часатрацтва не па мне. Калі гэта яны адны мяне клікалі, тады ўсё банальна. Разьвярнуся і пайду далей. Дарма разьятрылі.

# 2

— Зусім не, — кранулі чыесьці словы, і я мігам настроілася на прыймо.

Да мяне сьпяшалася Маро, трохі ўстурбаванае. Я гэта заўважыла дзякуючы ягоным інтанацыйным перападам.

— Кано, куды ты прапала? — эмацыйна, а пасьля і фізычна ўсё бліжэй было друхно. — Шукаю, гукаю, якія толькі поклічы не пасылаю: і пачуцьцямі, і думкамі, і іншымі псыхічнымі квантамі, нават хацела голасна закрычаць — а цябе нідзе няма. Я ўжо пачало думаць немаведама што: а раптам, мяркую, зноў накіравалі ў гэтае Вердзьдзе ці захапілі больш далёкімі зоркамі. А мо, барані Баго, заблазнавала і вырашыла разрадзіцца. Што з табой?

Я не хавала зьдзіўленьня ад такіх нечаканасьцяў, намервалася нешта адказаць, але, бачачы такое ўзбуджэньне, змоўчала і напрыканцы ўсхваляванага даўгаслоўя тольма ўсьміхнулася.

— Яно яшчэ хіхікае! — падроблена абуралася гаманлівае Маро. — Усё навакольле ходырамі ходзіць ад маіх перажываньняў, а яму сьмешна! Вось зараз як паласну гнеўна, дык усе твае шчупальцы скурчацца і цельцы закаркуюцца!..

— Ды дай ты мне хоць крыху мовіць! Памаўчы.

— Ох, і цяжка з такімі прыяцелямі! — уздыхнула Маро, паслаўшы затым маўклівую і ласкавую хвалю.

— Нікуды я не западзелася і не накіроўвалася, а нараджаць мне яшчэ рана. А вось што кранулі — сапраўды. І пэўна так, што я зьнікла з палёў успрыманьня, бо ты не змагло мяне знайсьці. Я нават і не падазравала, што звыклае будзённае станьнё можа мець такія наступствы, тым больш са мной.

— А што адбылося?

— Нічога асаблівага. Проста ў нейкае імгненьне мяне чамусьці пацягнула ўважыць адно мейсца, да якога раней я было абыякавае.

— Адтуль клікнулі?

— Я заўважыла гэта толькі потым. А дагэтуль абыкла зіркнула ўбок.

— Значыць, і звычайныя позіркі спрычыняюцца, што ўжо казаць пра ўсё астатняе, напрыклад, дзеяньні.

— Так, усё ўзаемалучнае, вынікае адно з аднаго… Але зараз няма жаданьня разважаць і філязафаваць. Мяне турбуе, чаму звыклае атачэньне, якое ні я яму ні яно мне, раптам гэтак увайшло ў маё сьведам'е?

— Мо хто гуляецца?

— Хм, сьмешна… А калі я глузьдзею?

— Гэта таксама спатрэбіцца. Для большага спазнаньня.

— Жартуеш. Можна бліскуча разважаць і нават слушна раіць, калі не датычыць цябе асабіста. А калі чапляе вось тут і тут, — і я пераканаўча паказала на сэрца і шчупальцы, — тады не да мудраваньня… Ат, годзе пра тое! Лепш распавядзі, чаму ты так палка мяне запыніла.

— Нагадваю: я цябе шукала, нідзе не знаходзіла… І ў нейкае імгненьне на хвалях дотыкаў да цябе я ўбачыла дзіўных зданяў досыць рознага начыньня і ўсхвалявалася… Тут жа рванула, знайшла тваё нэрвовае ўзбуджэньне і, не марудзячы, адпаліла што прыйшлося.

— Карацей, ратавала.

— Так.

— Няўжо былі сапраўдныя пагрозы?

— Яшчэ якія! Ты нібыта палымнела: і шчупальцы, і ўсе вонкавыя чуткія цельцы то йшлі чырвонымі плямамі, то цалкам ірдзелі, вызрываючы пры гэтым дзіўнае трымценьне, як відомае, так і гукавое, а хвосьце нязвычна мітусілася… Кано, я так дэталёва апавядаю, як быццам ты гэтага не адчувала само?!

— Не. Валваваньне было, але інакшае.

— Мо забудкі найшлі?

— Ня ведаю… Чакай, напружуся думкамі… Няма.

— Не магло ж ты выскачыць зь сябе? Рана яшчэ: ня высьпела.

— Зазірнуць у Сусьвецьце? Там усё адлюстраванае.

— Рызыкоўна. Нам тое пакуль зачыненае…

— Дзе б мы былі, калі б, мякка кажучы, ня стукаліся? Паспрабуем.

Зноўку ўзрушыліся мае глузды — і моцныя сыгналы паімчалі ўзвыш. Я нават фізычна крыху калыўнулася, спаймаўшы прыяцелевае насьцярожанае пазіраньне.

Невядомае замінаньне, як гальмо, перапыніла, спарадзіўшы лёгкае ўзбурэньне, але я пераадолела яго спрытна — і мае падумкі-кванты ўліліся ў агульнае рэчышча касмасовага Мысьленьня.

Мы з Маро спацямна пераглянуліся — і яно таксама рынула за мной.

## 3

— Дык вось што гэта! — уздыхнула я аблегчана.

— Так, узбуджэньне і здаволеньне, — вызначыла Маро і неяк загадкава паглядзела на мяне, а потым удалячынь. Гарэзьлівыя агеньчыкі бліснулі з-пад прыгожых павекаў. — Пачуцьці звыклыя, але ў якіх варунках! Пракаветных, забытых, цяжкіх і зусім неўявімых!

— Якое ў іх мяно было раней?

— Ня ведаю. Давай зьвернемся да касмасовых вакабуляраў.

Ліхаманкава й разам мы скокнулі да сусьветнага інфармацыйнага поля, хутка знайшлі неабходнае і, азнаёміўшыся зь ім, ахнулі — што спарадзіла яшчэ большае захапленьне.

— Цяжка й засвоіць: “юр, жарсьць, аргазм”, — напружвалася я, каб вымавіць.

— Словы дзьвюхплоцевых, — падказвала Маро. — Іх зручней усьведамляць, чымся казаць. А калі падключыць уваражэньне, уявіць, убачыць вобразы, тады больш сэнсоўна паўстануць інтымныя кантакты — дарэчы, вельмі прыемныя — паміж гэтымі істотамі. Зноў-такі — спазнаньне.

— А ты ўсё адно! Нешта мне яно зусім не па нутры. Па-першае, мяне цікавяць стасункі між вышэйшымі, а не ніжэйшымі стварэньнямі. Па-другое, баліць яшчэ мацней: чаму гэтае адбылося са мной? Я ж аднаплоцевае, мае продкі і сваякі таксама; нічым чалавечым, нават дзеля знацьця, не займаемся… Дзіўна… Калі зьяўляюцца неспадзеўкі — ідзе нешта важнае. Чаго мне чакаць яшчэ? Адкажы. Ты ж усё ведаеш.

— Калі б усё — мяне тут не было б. Кранула толькі пачуцьці?

— Так, фізычнае, — і я ўсёвідучым бачаньнем абглядзела сябе больш для самаперакананьня, чым дэманстраваньня, — засталося без рэагаваньня, акрамя сьпіннога.

— Гэта зразумела: там — мазгі. А ногі, рукі, хвосьце?

— Як звычайна, бяз дрыжыкаў.

— Двухплоцевыя ў такіх выпадках могуць і ўпасьці, самлець…

— Не, у нас жа іншае: канчакі больш фармавыя, чым функцыйныя.

— А мо што незнаёмае, нязвыклае было?

— Ды не, як бы…

— А ўсё-такі? — прыглядвалася да мяне Маро.

І я ад такіх двухсэнсоўных інтанацыяў крыху сумелася, выпусьціўшы колькі пярэстых хваляў, і завіхляла хвосьцем.

— Чаго ты дамагаесься? — вымавіла я зычна.

— Не турбуйся залішне, — улагоджвала мяне друхно таксама галосна. — Гукі нас не ўпрыгожваюць. Яны — наканаваньне ніжэйшых, — і нанова перайшло на тэлепатычныя зносіны, перадусім крыху падумаўшы.

— Чаму я дапытваюся? Растлумачу. Табе добра вядома, што кожнае з нас разьвіваецца па-свойму, індывідуальна, але па агульных правілах і кірунках. Яны пераважна прагрэсіўныя і пэрспэктыўныя. І ўсё-ткі сярод іх не-не ды трапляюцца астаткавыя, спадчынныя. Мабыць, гэта тлумачыцца тым, што ў нашым атачэньні працягваюць існаваць папярэднікі — людзі, якія валодаюць у асноўным састарэлымі характарыстыкамі і рэальна ўзьдзейнічаюць на нас. А пазбыцца такога, выходзіць, няпроста.

— Ведаю, гэта — праблематычнае пытаньне нават для Найвышэйшага кіраўніцтва.

— Так, раней Нябёсы столькі дазволілі людзям, што іхныя якасьці разьвіліся, расьпесьціліся-разбэсьціліся, сталі непадуладнымі, набылі формы ды пачалі незалежнае існаваньне. Ну, і навучыліся самастойна шукаць сабе носьбітаў. Разумееш?

— Безумоўна. Ты лічыш…

— Галоўнае: на ўсёдаступным касмасовым полі яны знайшлі сабе мейсца і ўсе правы-мажлівасьці для паўнавартасных дзействаў.

— А кармічныя законы?

— …прыйшліся дарэчы. Адразу разабрацца з саматворамі і ліквідаваць іх — ужо немагчыма. На ўсё патрэбнае часо. Мяркую: Там вельмі задумаліся.

— Цікава. А калі так запраграмавана?

— Магчыма, як і тое, што афэкты выклікае нешта іншае. Нам ня ўсё вядома.

— Вось менавіта. Абсалютаваць уласныя веды нельга — закон мутакаў.

— Яно-та так, але нам, мутакам, і дадзена, і дазволена больш.

— Памятайма: у межах індывідуальнага ўспрыманьня, ці бо разьвіцьця, — павучальна нагадала Маро пасьля невялікага задуменьня.

— Я на свае здольнасьці ня жалюся, — з раздражненьнем адрэагавала я.

Маро ўсьмешліва зыркнула на маё чульлівае цела, якое прыкметна заірдзела, на напружанае хвосьце і заўважыла:

— Але, твае рэакцыі багатыя. Тут я табе саступаю. Нездарма ўсякае відмо да цябе мігам ліпне. Льга думаць інакш.

— Так мне дадзена, — працягвала я сердаваць.

— Дадзенае — багацьце, якім ты вольнае распараджацца па ўмецтве, а яшчэ — па разуменьні — галоўным, чым цябе надарылі. Петрыш?

— Досыць мяне настаўляць! — я нэрвавала яшчэ больш і ад гэтага раскідвала ўва ўсе бакі мноства жарчыстых флюідаў. — Я што — немаўля?

— Цяпер менавіта яно. Як быццам толькі што адшчапілася і коўзаесься ў адных эмоцыях, — па-сяброўску шчыра і пяшчотна ўлагоджвала Маро.

Яно нават фізычна падоўжыла свае рукі й дакранулася імі да маіх галаўных цельцаў, ад чаго мне зрабілася дужа прыемна. Хаатычныя флюіды сьцішыліся, пасьвятлелі і — выпарыліся, нібыта іх і не было.

— Ну, вось, цяпер ты дарослае, — удавана сур'ёзна і гучна загаманіла прыяцеля падобна бацькам, калі тыя галубяць дзяцей. — І для гэтага трэба ўсяго толькі адно: сукоіцца.

Я заўважыла, як бясформенныя прывіды-элемэнталы-модусы таксама ніякавеюць і пакрысе, ледзь скалячыся, адыходзяць. Здавалася б, усё до-

бра, але суцэльныя думкі ўсё адно ня йшлі і паміж шчупальцамі яшчэ блукалі барвовыя агеньчыкі.

— Не хвалюйся, — падбадзёрвала друхно, пазіраючы навокал. — Яны не пасьпелі да канца цябе ачмурыць і забэрсаць, таму і злуюцца. А былі вельмі ласыя на новенькае… Гэта яшчэ раз дэманструе, да чаго могуць давесьці безадказныя разбэшчаныя гульні.

— Чые?

— Ну, ня нашыя ж з табой. Тых, хто ўсё гэтае робіць, — і Маро вачыма абвяло кола ў паветры. — Мы — усяго толькі служкі.

— А чаму мы на ролях… падпарадкаваньня? — агоўтаўшыся, пасьмялела я. — Усе ж — роўныя. Субстанцыйна створаныя аднолькава, рацыянальна, па падабенстве…

— І ты туды ж. Не па-мутацку разважаеш, Кано, — як знаўца, адзначыла Маро. — Касмасо пазьбягае аднакасьцяў і базуецца выключна на адрозьненьнях. А Часо нават пры жаданьні не дазваляе рабіць усё падобным: як кажуць людзі, у адно цячэньне ўвайсьці двойчы нельга. Дарэчы, павучыцца ў іх варта: яны захавалі шмат мудрасьцяў.

— Кінь глупства, Маро, — засьмяялася я. — Дзікунства карыснае толькі адным — хутчэйшым зьнікненьнем дзеля ачышчэньня прастаро.

Друхно паглядзела на мяне моўчкі, лохатна і памкнулася мовіць яшчэ штосьці, але вонка-

вые гучныя хвалі нечакана страсянулі ўсё жывое і прымусілі насьцярожыцца.

Так звычайна паводзяць сябе людзі, калі ў іхных мясцовасьцях нешта здараецца. Распаўсюджваньне залежыць не ад воддаляў, а ад адзнакаў стацьця: вялікія кранаюць усіх і паўсюль, меншыя — выбраных і поблізь. Гэныя былі хутчэй сярэдняга напаўненьня, бо не знайшлі нашага глыбокага душэўнага адгалосься. Мы толькі зьлёгку хістануліся нутром і маглі б больш ніяк не рэагаваць, але ўзаемнае жаданьне зьменаў памкнула абодвух да месца. Ад Маро цягнула нейкім заклапочаньнем.

# 4

Як падумалі, так і скочылі: мігам, безь перашкодаў. Прагныя да ўсяго незвычайнага, цікавага.

Гэта было сяло.

Цудоўнае аблоньне. Пагорыстыя, лясістыя краявіды. Гарачае сонца, духмяныя краскі. Нам аж духі заняло ад прыемнасьцяў.

Толькі ненадоўга. Хутка забралі мінорныя абставіны. Паветра праціналі тужлівыя, жалобныя настроі: адбываліся людзкія хаўтуры. Я ведала, што гэта такое, але ніколі не прысутнічала.

— Відовішча сумнае, — патлумачыла Маро. — Але дужа дзіўнае сваімі бяссэнсіцамі.

— Чаму? — выразіла я сумненьне. — Гэта іхняе існаваньне. Калісьці і мы так жылі.

— Ня ўсе, — цьвёрда і катэгарычна адрэзала Маро, пахмурнеўшы.

І я зразумела, што дарма абагульніла, бо маё друхно было іншага касмасовага дасьведчаньня, людзкія практыкі не ўхваляла і заўсёды абурана крытыкавала іх.

Мы абодва адчулі сябе ніякавата, і я, каб згладзіць палажэньне, прапанавала патлумачыць такія парадкі людзей.

— Тут я буду заўжды прадузятае, — спакайней сказала Маро і надумліва паглядзела на хаты, — А ўяўленьне павінна быць поўным і больш-менш аб'ектыўным. Таму зараз я пазнаёмлю цябе з адным зь іхніх аніманаў, якія кампэтэнтныя і кантактуюць з намі. Запомні: гэта — асаблівыя разумныя: яны хоць і адаптаваныя да нас, мутакаў, усё адно застаюцца людзьмі, жорсткімі, хцівымі й злоснымі. Яны нам ня вераць, лічаць, што мы таемнічаем і, зьмяняючыся вонкава, хітруем ды падманваем іх. Заўсёды будзь напагатове і ўважліва сачы за іх паводзінамі, асабліва вачыма. Мне трэ адляцець па сваіх справах, таму я прысутнічаць ня буду. Кано, прашу: кантралюй свае эмоцыі і больш чэпка прыглядайся да атачэньня, каб зноў не зьбянтэжыцца.

Прыяцеля ўзбуджана зайграла хвосьцем, нутром і выпусьціла некалькі дрыготкіх аблачынак.

Я супакоіла яго, адказаўшы ўмільчыва і лёгкімі эмацыйнымі павевамі, якія хутка разагналі хмаркі.

У тыя самыя хвілі мы наблізіліся да прыгожага збудаваньня пасярод сяла. Маро паслала некалькі бязгучных сыгналаў і атрымала такое ж пазваленьне, каб ўвайсьці.

# 5

Раней я мела мімалётныя ды выпадковыя кантакты зь людзьмі, ніколі не цікавілася імі і ня мкнулася да іх. Мабыць, гэта йшло ад таго, што мяне, наагул, вабіла больш прыйсьце, чымся мінулае.

Homo sapiens, ці карэкі (па-іншаму: арыі, адаміты, хомы), былі нашымі папярэднікамі. Асноўныя інкарнацыйныя якасьці яны разьвілі ў Вялікім Пятым Увасабленьні, а ў нашае, Шостае, перайшлі, каб, згодна з кармічнымі законамі, даастатку пераджыць дадзенае і ачысьціцца, займець годнае духовае зьмесьціва для нараджэньня ў наступных касмасовых Кругах. Як і ўсякае стварэньне перад выміраньнем нудзіцца, сьмярдзіць і дакучае, людзі ўжо даўно нурацца, гаршэюць, усё ганодаюць ды патрабуюць залішняга абыходжаньня. Мы ў любых умовах іх не пакідаем: дбаем, шануем, ахоўваем. І няшчырымі нас ніхто не назаве. Хоць я лічу, што ўсе, разумеючы законы наканаваньня, насамрэч больш прыстояць і шка-

дуюць карэкаў, якія толькі замінаюць і ўжо даўно павінныя адысьці ў небыцьцё. Але самі яны лічаць інакш і чапляюцца за любое доўгае фізычнае існаваньне — і гэтым нас надзвычай дзівяць.

З такімі ўяўленьнямі я і ўвайшла ў жытло.

— Анто, — вусны прыгожа раскрыліся, і важкія пальцы пацягнуліся насустрач. — Па-нашаму — Антось. Але я буду падладжвацца пад вас.

— Кано, — мысьлёва і відзебна ўсьміхнулася я, хуценька завіляўшы хвосьцем і далёка выпрастаўшы складзеныя дасюль рукі.

Іх падхапілі ў паветры і пацiснулі. Я войкнула.

— Маё друхно ўпершыню здароўкаецца зь людзьмі, — прыязьліва патлумачыла Маро, — таму так рэагуе.

— Прыемна вітаць у нашым бязьмер'і нэафіта… Ах, прабачце, — ад Анто адразу адскочыла выпраўленьне, — ноўцу.

Праз імгненьне ягоныя блакітныя вочы аблашчылі нас:

— І што прывяло вас да мяне?

# 6

Маро разьвіталася, і мы засталіся з Анто самнасам.

Гутарылі спачатку стрымана, прыглядаючыся адно да аднаго, а потым — свабодна і ўзбуджана. Гарачыліся, спрачаліся і нат злавалі.

Я доўга не магло прызвычаіцца, што насупраць сядзіць і нароўні са мной разважае няцэлае, палавіністае, а значыць, і недасканалае стварэньне: якое меркаваньне і паняцьце яно здольнае мець, і ўвогуле ці паўнавартасныя нашыя зносіны?

Пра няёмкія сумневы я паведаміла галосна, бо заўважыла, як Анто падазрона пазірае на мае шчупальцы, якія ўстурбавана хваляваліся і часта пераафарбоўваліся, і мысьлёва будуе ўсялякія здогады. Некаторыя для мяне былі непрыемнымі, нават пагрозьлівымі.

Мае словы яго не пакрыўдзілі, а расьсьмяшылі. Было крыху жахліва назіраць гэтыя чалавечыя сутаргі.

— Во недарэкі! — уздрыгвала ягонае цела. — Самі недапечаныя і стратныя, а валяць усё на нас! І сьмейся, і плач! Як дайсьці да іх, растлумачыць: мазгі-та набакір?

— Глузды і ў цябе, і ў мяне нармальныя, — спакойна рэагавала я. — Гэта, бадай, адзінае, чым мы падобныя, а вось астатнім — розныя… І менавіта ў разуменьні "чаму?" — адказы на ўсе пытаньні.

Такое тлумачэньне для мяне самога зьявілася неяк спантанна. У думках я хуценька азірнулася: мо хто сочыць за намі й падказвае? Нікога. Але хіба знойдзеш каго пры такім імгненным і слабым канцэнтраваньні?

— Колькі іх ні задавай, — нічога не заўважаючы, працягвала маё візаві, — мы ніколі ня здолеем па-сапраўднаму зразумець і адчуць адно аднаго. Вы заўсёды будзеце лічыць нас недамутакамі, а мы вас — недачалавекамі. Клішэ вядомыя. Адно: дзьвюхплоцевыя ад цела да нутра разьдзеленыя папалам, на мужчынскае і жаночае, таму і заганнае. Другое: бясплоцевыя — суцэльныя прымітыўныя і спрошчаныя істоты, пазбаўленыя глыбіняў жыцьця.

Увогуле я пагадзілася зь ім, выразіўшы тое лёгкім варушэньнем сваіх шчупальцаў, пазіраньне Анто на якія было разумелым, а потым, нарочыта настроіўшыся на яго, пераканалася ў нежаданьні абмяркоўваць тэмы нашага існаваньня. Сапраўды, ці варта было рабіць гэта, бо, па-першае, ніякае нашае філязафаваньне, як сьмяротных, ніколі не ўплывала на Боскае Прызваленьне, а па-другое, мы пазнаёміліся для іншага.

— Значыць, цікавяць толькі абрады, — выйсьце да Анто прыйшло хутчэй, чым да мяне, чаму я вельмі зьдзівілася, зноў перафарбаваўшыся.

— А вы лічыце, што мы — боўдзілы і да нічога няздатныя? — дужа хітраватае намяненьне вынікла ў яго пры пагляданьні на мае мэтамарфозы.

— Зусім не, — нанова запярэсьцілася я, ня ведаючы, што і мовіць. — Якое б ні было стаўленьне мутакаў, мы ад вас неадрыўныя. — І праз колькі ўздыхаў: — Я — надта ўражлівае, і многія ваганьні асяродзьдзя ўспрымаю адразу, часам балюча. Тое, што ішло ад вашага паселішча, паўзьдзейнічала сьпярша на мяне, апасьля і на майго друхна. Мы вырашылі дазнацца.

— Я паважаю і выдатна знаю Маро, — чало Анто зморшчылася, а вочы сягнулі ўгару. — Па-нашаму, цікавы і мудры чалавек, катэгарычных меркаваньняў і скрайніх высноваў. Нам зь ім цяжка. Але мы стасуемся, бо ягонае правіла — лічыцца зь іншымі поглядамі і дамаўляцца без насільля. Такіх заўсёды было мала. А спрычыніліся да вашага падарожжа ня толькі паховіны — іх абрадавыя асаблівасьці яму добра вядомыя і маглі быць растлумачаныя безь мяне. Нешта інакшае пастукалася. Што?

Я зацікаўлена слухала Анто і прыкмеціла ягонае мысьлёвае ўзбуджэньне, выкліканае пошукамі адказаў. У нейкае імгненьне яго трохі страсянула і павярнула да мяне. Незнаёмае прасьвятленьне ахапіла ягоныя зьвіліны, і я адчула, як мяне скануюць.

— Цябе нешта турбуе? — пытаньне Анто прагучала не адразу.

— Нічога, — аўтаматычна мовіла я, інстынктыўна ведаючы, што людзям часам дастаткова проста аднаго, няхай і непраўдзівага, слова.

— Не падманвай. Я бачу.

Гэта мяне ўразіла і выклікала адпаведныя вонкавыя і прыкметныя хваляваньні цела: нарэшце дайшло, што я цалкам адкрытае. Як гэта? Значыць, хавацца перад людзьмі таксама немагчыма. А казалі…

— Не пужайся. Гэта я — такое рэдкае сярод карэкаў празорлівае стварэньне, таму і кірую тут. Іншыя — звычаныя. А ўзапраўды: таемства і сукрыцьце — галоўныя асаблівасьці нашага жыцьця. На іх трымалася ўсё Вялікае Пятае Ўвасабленьне й існуем мы цяпер. Вашыя гэта скарыстоўваюць і шкодзяць, вось за тое мы вас і ня любім.

Мне было непрыемна чуць такое і няёмка за нас, мутакаў: паўсюль казыраем, што мы — празрыстыя, адчыненыя, таму толькі болагія, а насамрэч яшчэ і дрэнныя, здатныя на гідкае. Прызнаваць гэта вельмі цяжка, для некаторых — немагчыма. А іставетна адно: і ў нас, і ў людзей Творцы заклалі ўсё — дадатнае, адмоўнае, вырашаюць толькі абставіны, варункі.

— Менавіта! — пацьвярджэньне Анто ўжо не зьдзівіла: я абвыкала і паводзіла як са сваімі. — Галоўнае: ты і я — стварэнцы Божыя. Як павя-

дзёма, такімі й будзьма. Гэта кожнае з нас павінна зразумець перш-наперш.

Я ўспыхнула агнёва і жарсна, бо атрымала такое выдатнае прадоўжаньне сваіх ранейшых думкаў. І ад Анто таксама пацяклі хвалі шчырага задавальненьня.

# 7

Трохі пачасаваўшы, мы вярнуліся ў ранейшае рэчышча, і я зноўку адчула капорсаньне вакол мяне.

— Што такое? — захвалявалася я і пачало азірацца.

— Тут акрамя нас нікога нямашака. Дарэчы, чалавекамі мала цікавяцца: што ўзяць ад тых, хто памірае? Этэрныя каналы даўно перасохлі, зносіны толькі праз Касмасо, дый тое аднабаковыя, — райскае спакойнае быцьцё. Так што цесься: цяпер ты асланёны раўнадушшам сваіх. Ха-ха-ха!

Ягоныя хіхоты былі прыемнымі і зычлівымі, ад чаго і мяне ўзяло сьмяхоцьце: як цудоўна мне адказалі!

— Гуляць у хованкі бессэнсоўна, — у Анто пасур'ёзьнелі матывы, — я кажу наўпрост, як, упэўнены, размаўляла і б Маро, навучаючы цябе: з табой нешта дзеецца, бо ты, ня ведаючы, кранула рэдкія касмасовыя струны і вы-

клікала адпаведныя рэзанансныя зрухі ў іншых сьветах.

— Ніколі ня думала, што звычайныя павароты вачэй, іх скіраваньне на штосьці прыемнае прывядуць да такіх вынікаў, — я паспрабавала неяк унікнуць паглыбленьня.

Зусім не хацелася выварочваць нутро: мы хоць і празорныя, але глыбокія індывіды з характарамі, на недасяжным доньні якіх запаветнае, Баговае.

— Так, у якіх бы вымярэньнях мы не выяўляліся, толькі Баго, Numen, ведае ўсё даастатку, — абагульненьне Анто было бясспрэчным і папярэднічала іншым думкам, і я насьцярожылася. — Цябе ніхто не прымушае, але нам з Маро ведама лепей, і мы імкнемся табе дапамагчы. Я бачу, што струны яшчэ нацягнутыя і можа адбыцца паўтарэньне, больш мацнейшае.

Я нічога няўтульнага не адчувала, таму такія размовы не ўспрымала належным чынам і лічыла, што мае прыяцелі перабольшваюць.

— Маладзёны паводзяць сябе спачатку самаадзейна, — спробы перaканаць не пакідалі Анто, — а потым, калі відавочнае бярэ за горла, пакутуюць і прымаюць. Каб пазьбегнуць ліха, раю прыслухацца адразу, можа, пакуль і без жаданьня. Дрэнна ня будзе: мы ж з табой. А пазьней разьбярэсься. Хто ведае, а раптам усё скончыцца радасна.

— Ох, як мне гэта надакучыла! — замахала я адначасна і рукамі, і шчупальцамі, згаджаючыся. — Працінайце! Зерце! — і адчыніла ўсе свае фібры.

# 8

Калі агоўталася, знайшла сябе ў іншым месцы побач з Маро і Анто. Мне здалося, яны адпачывалі і пачувалі сябе няблага.

Як высьветлілася, гэтаму паспрыяла я. І якім чынам?

— Дзякуй, Кано! — першым заўважыла маё ачхненьне Маро. — Я ніколі ня думала, што здольнае на такія перажываньні.

— Будзь здаровае на доўгія гады! — пажаданьне Анто гучала шчыра і натхнёна. — Атрымаць такое ад мутакаў — невымоўнае шчасьце.

Я неўразумела пазірала на абодвух і ня ведала, што мовіць. Унутры блукалі, заціхаючы, незнаёмыя кунежныя почавы.

— Тое, аб чым мы кажам, — тлумачыла Маро, — ляжыць у тваіх глыбокіх і істых сховах. Ты — вельмі таленавітае стварэньне, здольнае на неабмежаваныя самавыяўленьні па натхненьні ў любым зь Вялікіх Увасабленьняў. Такімі якасьцямі звычайна валодаюць істоты даўняга касмасовага паходжаньня і глыбокіх традыцыяў. Усё было б добра, калі б ад перанапружаньня сьведам'е

не пакідала цябе і самнамбулічныя ўчынкі не авалодвалі табой. Як высьветлілася, твае ператварэньні ўзьнікаюць ад моцнага эмацыйнага страсеньня, спалучанага з глыбокімі перажываньнямі. Без памагатых тут не абыдзесься.

— Вось мы і дапамаглі табе, заадно знайшоўшы прычыны тваіх апошніх дзіўнасьцяў.

— Карацей, выкрылі і адчулі твае здольнасьці. Як бачыш, засталіся задаволеныя, асабліва ад таго, што ты маеш усе змогі высока ўзьляцець. Але — пры належным кіравецтве.

Я ўважліва слухала і заўважала, як над спрыямі ўзьнімаліся калярыстыя болачкі, нестасаваныя да казанага. Мяне тое забаўляла, выклікаючы міжвольныя сьмевы і адпаведныя выпарэньні.

— Ты дзе? — зацікавілася Маро.

Я сьмешліва паказала вачмі ўгору.

— Зразумела, — аслабілася яно. — Такое не схаваеш.

— І ня трэба! — узбуджэньне хістанула Анто, выявіла ягонае замілаваньне. — Прыемна, што людзкія пачуцьці вам пасуюць. Ух, якія мы жарскія! — і двухсэнсоўнае мірганьне з пацепваньнем авалодалі ім. — Тваё запальчывае сэрца, Кано, не закілзаеш. Духовым парываньнем яно ахапіла ўсё. Якое чарадзейства!

— Без утойваньня, нам радасна быць пакліканымі і весьці цябе, як абранага, да вышыняў, — шчыра мовіла Маро і, азірнуўшы ўсіх, узьнёсла гукнула: — Дык наперад!

# 9

Моцныя сэнсоўныя бруі пранізалі маё цела. Усе валокны рэфлекторна страпянуліся і сталі вылучаць кванты неспазнанага значэньня. У нейкіх закуточках майго сьведам'я мільганулі няясныя асацыяцыі і, не аформіўшыся, прапалі.

Адляцелыя энэргетычныя імпульсы загучалі, замітусіліся, кругаваротна злучаючыся і ўтвараючы зіхатліва-гаманлівае цячэньне, якое гарэзьліва пабегла ўдалячынь і памкнула за сабой усё мысьленьне. Насустрач несьліся дзіўныя перапоны з размаітых зораў, плянэтаў, рэчаў, істотаў, зьяваў, якія, залежна ад наканаваньня й характараў, складваліся ў спагвезьдзі, касмасовыя пласты, ці бо адметныя жыцьці, расьцягнутыя і ў часо, і ў прастаро. Мяне вабіла да іх.

— Безумоўна! Яны твае, — данесьліся да мяне галасы Маро і Анто.

Я так захапілася, што не заўважыла іхняе прытымбыцьце. Яны луналі бліз як фантомы і назіралі мэтамарфозы таксама зь вялікім пахічаньнем.

— І вашыя! — весялілася я, адчуваючы прыемнае прыцягненьне аднаго з пласьценяў.

— Не, толькі твае, — сыгналы ўзбуджэньня ляцелі ад Анто.

— У такім мностве? Аднаму? А вам?

— Гэта — тваё сьвецьце, тваё галяктычнае прывольле, — з такім самым узбураньнем адказвала

Маро, разглядваючы найбліжэйшае сузор'е. — Мы, як кажуць, у цябе ў гасьцях і на паслугах.

— Што загадаеце, вашае высокаснае? — пракаветнае выдыганьне Анто на фонах плянэтаў выглядала пацешна. — Ці мо само выканаеце?

— Канечне, самастойна, па-собску, але разьлічваю на спамочаньне, ваша! — гульліва ўздымаючы бровы, вялікасна мовіла я.

Гэтак, забаўляючыся, мы апынуліся ў абдымках зямных рэаліяў, якія прыцягальна мільгалі перад нашымі споглядамі.

— Кано, ты ўваходзіла ў плянэтарнае жыцьцё цікава, адмыслова! — назіраньне Анто было пільным, глыбокім і неадрыўным. — І зусім ня так, як павінна быць па сцьверджаньнях навукоўцаў або рэлігійцаў... Я губляюся... Чаму і каму верыць?

— Ну, толькі ня вашым людзкім аблудам і казкам! — успыхліва адрэагавала Маро і, крыху памаўчаўшы, дадала: — Дый і ўяўленьні мутакаў, хоць куды правільнейшыя, усё адно прыкметна адрозныя ад таго, што мы бачым. Усім нам варта грунтоўна памазгаваць.

— А што тут думаць? — не стрымалася я, бо не жадала ніякіх дыскусіяў, тым больш у асабістых уладаньнях. — Я лічу ўсё гэтае, — і маё іства закалацілася ад прагнага аб'ёмістага ўспрыманьня, — не чарговае глябальнае ашуканства, а доўгачаканае праўдзівае адкрыцьцё аб'ектыўнага становішча. Нам трэба прымаць

яго адразу і канчаткова, каб нарэшце нармальна і ясна існаваць.

— Маладое — гарачае, — Маро прызадумалася, гледзячы то на мяне, то на карціны майго летапісаньня. — Лёгка так развважаць, калі ў цябе ёсьць такія пераканаўчыя здольнасьці бачаньня. А як быць астатнім, звычайным стварэньням, глухім, сьляпым? Зноў паверыць чарговым байкам? Колькі іх было? Безьліч! Лягчэй стала? Таемства, ліха і пакуты зьніклі? Дудкі! Адны трансфармаваліся, а іншыя, па законах размнажэньня, павялічыліся. Пад сонцам так было, ёсьць і будзе. Льга запамятаць: у праўдашуканьні на нешта значнае, што ідзе ад сьмяротных, спадзявацца ніколі ня трэба, як ад тых, хто дае, так і ад тых, хто атрымлівае. Толькі Найвышэйшае, Боскае Прызваленьне спасылае нам сапраўдныя веды. Яны йдуць адрасна, індывідуальна, парцыённа. Іх неабходна адчуваць, разумець і захоўваць. Рабіць гэта — найлепшае навучаньне і самае надзейнае арыентаваньне.

Над Анто падніmaліся лёгкія выпарэньні і разуменьня, і намераў спрачацца. А ад мяне адляталі згусткі раздражненьня, таму што спрыяі не прымалі маіх перакананьняў адразу.

— Вы ня верыце майму бачаньню? — крыўдавала я. — Вось гэтаму? — і я шчодра кідала свае чуцьці ўва ўласнае сусьвецьце, каб яшчэ раз, мацней даказаць, што ўсё сапраўднае. — Адкуль

яно? Не ад Баго? Не Яго Прызваленьне? Не рашэньне Адзінага на маё існаваньне? Тут усё малое, усе часьцінкі кажуць-крычаць: мы — Баговыя, ад Яго пайшлі і да Яго вернемся! Бярыце, любіце і шануйце нас! Мы — гэта вы! Усе — адно і ў Адным!

Маё апантанае красамоўства паўзьдзейнічала на прыяцеляў. Яны шчыра ўсхваляваліся і памкнуліся да мяне, нібы баронячы і шкадуючы. І я ўбачыла за іхным агульным валваваньнем нешта глыбока таёмае, запаветнае, істае, але пагрозьлівае для неасьвечаных. Намагчыся і дастаць яго? — было б сьмешна й глумна. Я гэта ўсьведамляла і ад бясьсільля крыўдавала-гаравала.

— Ты не бядуй, — почаўнае і гучнае суцяшэньне Анто кранала асабліва, бо было чалавечым, і я ўпершыню так пранікліва адчула адрозьненьне. — Мы з Маро нездарма запрэгліся ў апякунства і вядзём цябе. Сапраўдныя веды і мудраваньне даюцца нялёгка, а валоданьне імі — адказнае абавязаньне: галоўнае — не нашкодзіць. Вось і мяркуй, хто такія адэпты. Яны штосьці кажуць толькі спазнаўшаму праўдзівае. Хутка ты будзеш сярод такіх. А пакуль…

— А пакуль, — Маро таропка перапыніла друхна і жвава ўзялося за кіравецтва, — мы адправімся ў далейшае падарожжа па лёсах.

— Чакайце! — разгубілася я. — У нас жа былі мэты, скіраваныя выключна на мяне… Хіба ўжо

ўсё? Так хутка. Я не адчуваю набыцьця. А гэта? — і ўсім іством паказала на свае жыцьцёвыя шляхі наперадзе. — Мяне яшчэ шмат! Ці вам нецікава і вы перадумалі?

— Не турбуйся. Напрамкі не зьмяніліся, — тлумачыла Маро. — Мы па-ранейшаму займаемся толькі табой і тым, што вынікае зь цябе. Тваё галяктычнае поле вялізнае. Перакрыжаваньняў і ростаняў на ім мноства. Сустрэчаў безьліч. Сьлядоў — відзьмо-невідзьмо. А колькі чужых жыцьцяў ты закранула?! Якія думкі, пачуцьці нарадзіла?! Толькі тваё наўмянальнае ядро, аб'ектыўнае і абсалютнае, бліжэйшае да Баго, захоўвае ўсё да драбніцаў. Штосьці з гэтага нам дазволена зараз спазнаць. Сьпяшацца ніколі ня трэба. Спадзяемся на Часо: яно заўсёды падказвае. Як, штуршкі ёсьць? — Маро зьвярнулася да мяне.

# 10

Я сканцэнтравалася і пачало слухаць унутрана.

— Нічога, — варухнула я шчупальцамі, хвосьцем і паглядзела на прыяцеляў.

— Ня можа быць, — вусны Анто ўсьмешліва расьцягнуліся. — Калі ты кідала позіркі на нас, паміж нічога не заўважыла?

— Мільганула вось гэтае асяродзьдзе, — я няўцямна скурчылася і нанава павярнулася да тых самых краявідаў, што выніклі раней.

— Слушна, — спачатку ўхваленьне, а потым і тлумачэньне мякка адышлі ад Анто. — Цяпер яны назвоч. У злучве рухаў і почаваў падаюцца знакі. Вучыся назіраць.

І ўсьлед — зьдзіўленьне:

— Во як! Знаёмыя мясьціны! Дык мы, атрымліваецца, аднымі сьцежкамі ходзім! Падабнюсенька мазгуем! Тады нашыя справы пакоцяцца ладненька! — далоні Анто сьціскаліся ад задавальненьня. — Тут палюдзкуемся ўахоцьце!

Маро таксама зь цікаўствам аглядала новае паселішча людзей, імкнучыся знайсьці нешта сазгучнае.

— Мне гэта нічога не нагадвае, — казала яно, усё назіраючы, моршчачыся і пацепваючыся. — Асацыяцыі ёсьць, але ня вельмі прыемныя.

Я наогул не рэагавала ніводным пачуцьцём, шукаючы адказу, чаму так зьбеглася ды выявілася і падсьведам'е ніяк не сыгналізуе?

— Значыцца, — уменьне Анто адгадваць ужо не зьдзіўляла: мы з Маро прымалі яго за свайго, — нават пры такіх варунках, — ягонае кругавое вярчэньне вачмі і думкамі захапіла і нас, і зоркі, і ўсё касмасовае атачэньне, — вам не дадзена, штосьці замінае.

Мы з Маро пераглянуліся, адно аднаму паслалі колькі спаталыжаных эмоцыяў: няўжо веданьне Анто большае за нашае? Насуперак усяго эвалюцыйнага разьвіцьця?

— Калісьці казалі: мудрэюць ня толькі ў палацах, а калі трэба маліцца — гані ад сябе сабакаў, — разуменьне Анто было найвысокае, і мы крыху сумеліся, не дасягаючы. — Пакуль нічога чапаць ня будзьма, тым больш сьвятога і чыстага. Давайце лепш пройдземся. Няўрокам нам падкажуць, — і ягоныя хітраватыя спомігі скокнулі да нас.

Вырашылі рухацца фізычна і аднолькава, галосна абвяшчаючы аб зьменах.

— Не забывайма, што мы ў галяктычным рэчышчы, Кано.

## 11

Словы Анто прагучалі дарэчы, бо праз некалькі крокаў, вынікшы немаведама адкуль, да нас кінулася крыклівае дзяўчо:

— Вось яны, людажэры! Трымайце іх! Інакш маё шчасьце саўсім зьвядуць! Нячысьцікі! Яго, даверлівага, спразнусьцілі, адабралі! На мяне пракляцтва навялі! Людцы добрыя, дапамажыце! Хапайце іх! Біце! Гора, гора!

Нас агаломшыла. Каго тое тычылася? Мы толькі што зьявіліся, усё ўпершыню… Мо хіба Анто? Мог калі апынуцца сярод сваіх? Адкуль у яго такія ўпэўненыя паводзіны?

Якое ж было дзіва, калі ўрэшце асноўнае дзявоцкае ўзбураньне накіравалася на мяне.

Я ня ведала, што рабіць, і, як магло, стала бараніцца ад прыставаньняў зьнерваванага стварэньня. Маро доўга ніякавела, таксама не ўяўляючы, як сябе паводзіць. Аднаму тольма Анто было сьмешна і, здавалася, усё зразумела. Ягоныя ўзбуджаныя, агнёвыя вочы то цікавалі за здарэньнем, то мітусіліся па баках, быццам бы кагосьці шукаючы. Мабыць, такія сустрэчы для яго былі звычнымі.

— Я проста ведаю людзей, — тлумачэньне Анто крыху супакоіла, але напружаньня цалком не зьняло, — і разнастайнасьці, варыяцыі падзеяў. Калі яны асабістыя — лёгка: дастаткова ўспомніць, узгадаць патрэбныя абставіны, свае паводзіны пры тым, ваганьні — і напрамкі быцьця адчыняюцца. Цяжэй разьбірацца ў чыіхсьці лёсах, як цяпер.

Маро маўкліва зеціла навакольле, пэўна, разумеючы казанае. Я ж зусім ня петрыла, але патварала ім, імкнулася ўнутрана не варухацца. І ўсё адно хвалявалася. Тым больш дзяўчо не адставала, прыціскалася да мяне, заглядваючы ў вочы. А хутка з-за хатаў пасунуліся карэкі — і мне стала зусім не па сабе. Я прыгадала, як паводзяць пры сонных трызьненьнях, і пажадала сябе ўшчыкнуць альбо ўзрушыць.

— Кано, літаральна не сьмяшы людзей і не насьцярожвай іх: кінь маніпуляцыі! — цяпер ужо сьмяялася Маро. — А то яшчэ прымуць

нас за дэманаў ці іншаплянэтцаў. Хай падыдуць. Будзьма размаўляць спакойна.

Сяляне наблізіліся, убачыўшы свайго, спыніліся і сталі моўчкі пазіраць. Найдзіўнейшага відовішча нельга было прыдумаць: назвоч абдымаліся мутака й хома.

— Вы пакуль маўчыце, ня ўмешвайцеся, прымайце ўсё як належнае, — сьпярша словы Анто адрасаваліся нам з Маро, а потым — усім: — Шаноўныя! Мы трапілі да вас не наўмысна, а выведваючы галяктычныя шляхі вось гэтага мутакі, каб яму ж і дапамагчы. Вашае зямное адгалінаваньне нам невядомае. Чаму мы апынуліся тутака? — і самі ня знаем. Таму давайце разам разьбярэмася і дапаможам адно аднаму.

Мы з Маро зразумелі, што на Анто пасьля назіраньняў таксама напала замяшаньне, тым больш, ягонае нутро вылучала бязладнае мітусеньне. Значыцца, мы стрэлі нешта нязвыклае і ніхто яму пакуль ня можа даць неабходнага тлумачэньня. Мне было вельмі няўтульна: усё з-за мяне!

Няўжо маё падсьведам'е скокнула…

— Так, — падхапіла Маро і працягнула дзе гучна, а дзе мысьлёва: — да варыянтаў забочнага ці, як кажуць, сухога быцьця? Туды, дзе, насуперак усім законам разьвіцьця і значэньня, ніколі нічога ня спраўджваецца: намеры

й думкі, ледзь нарадзіўшыся, астыгаюць, грубеюць, дранцьвеюць, а пасьля разам са сваімі носьбітамі зьнікаюць з плянаў, драбнеюць-мізарнеюць, ператварыўшыся ў нікому невядомыя першасныя крупінкі, этэрныя кванты.

# 12

Я перапалохалася, адчуваючы побач дзявочае цела, якое калацілася і палымнела ад невядомых пачуцьцяў, і не ўяўляла, як дзейнічаць. Маё няёмкае становішча заўважалі ўсе. Людзі нячутна перагаворваліся, зьверавата паглядваючы на нас.

Трэба было неадкладна браць стырно ў свае ру́кі — і Маро сыгналізавала да Анто: ратуй далей! Тут жа ад друхно зацурыла сапраўднае збаўленьне:

— Мы ідзём тольма з добрымі намерамі і зусім не зьбіраемся разлучаць мілосьнікаў, як гэтых, так і ўсіх астатніх. Глыбока паважаем астоі вашага грамадства, апірышчам якога зьяўляецца каханьне, і нізка схіляемся перад вамі. Не гаршэньне з блудадзействам, як лічаць некаторыя, а глыбокае жаданьне спазнаць найцудоўнейшыя таямніцы гэтага вялікага пачуцьця рухае і заўсёды натхняе нас. Сьведчаньне таго — вось гэтыя закаханыя. Няхай жа яны любяцца і радуюць усіх нас!

Такое абыходжаньне паўзьдзейнічала на карэкаў. Яны заківалі галовамі і ветліва заўсьміхаліся, сутарна паказваючы рукамі на нас. Дзяўчо пры гэтым сарамліва цопала, кідаючы зіркі долу. Я па-ранейшаму нічога не кумекала і ўстурбавана раскідвала шчупальцы, віляла хвосьцем.

Па ўсім было бачна, што Анто разумее асаблівасьці паводзінаў суродзічаў і мкнецца пабудаваць такія зносіны, якія былі б прымальнымі для ўсіх, і, галоўнае, ратавальнымі для нас.

— Абдымайцеся і мілуйцеся! — неслася ад яго.

Я спрабавала прытуліць да сябе арыё, але атрымаліся адны няўмелыя і брыдкія рухі.

Зборышча сьмяялася і выкрыквала, як мне падалося, непрыстойнасьці.

— Людцы! — заспакойваць у Анто атрымлівалася няблага. — Нашыя каханкі адкрыта саромеюцца. Дамо ім інтымнага асяродзьдзя! Няхай крыху падвучацца, патрэнуюцца. А такое хутка не адбываецца. Пачакайма!

І ягонае рашучае паварочваньне да Маро красамоўна паказала, што трэ разыходзіцца і заняцца сваімі справамі. Абодва, сушчэпленыя, паімчалі ўзвыш. Людзі пачалі разбрыдацца.

Я ж зноўку роспачна пазірала і гублялася ў намерах. На маё шчасьце, адыходзячыя загукалі:

— Юлё! Хадзі сюды! Не сьпяшайся! Пасьпееш! Ня мерайся зь лярвамі! Падумай: хто ты? Ганарыся!

Дзяўчо адскочыла ад мяне і, кінуўшы два вабныя пагляды, пабегла.

А мне тое і патрэбна было. Я мігам пырхнула да настаўнікаў.

# 13

— Прыгожае стварэньне! Сьмелае, цнатлівае, гурнае! — захапленьне Анто лунала гэтак жа апантана, як і нашае агульнае памкненьне: хутчэй і далей ад здарэньня! — Прападзе яно там.

— Гэта чаму ж? — насьцярожылася я, маючы спадзяваньне абмяркоўваць перш-наперш мяне, а не кагосьці іншага, пагатоў чужога.

— Умовы сухога быцьця такія, — тлумачыць узялося Маро, гледзячы на мае калярыстыя псыхічныя вылучэньні, — што ўсе пятрэюць, чэзнуць, зьнікаюць — і лічаць гэта за неабходнае, наканаванае.

— А хіба мы інакш успрымаем сваё сьмяроцьце? — абыякава пытала я, уздыхаючы.

— Слушна. Але сухавікі адрозьніваюцца тым, што спыніліся, дажываюць і ня маюць будучага, то-бок усё завяршаецца: учынкі, пачуцьці, думкі — апошнія, адбыўшыся, не працягваюцца, не нараджаюць новых, марнеюць.

Увогуле, зубожаньне — галоўнае акрэсьленьне, найменьне такіх сьветаў.

— Таксама, як і ў нас, — ужо злавала я, прадчуваючы недарэчныя мудрагелістыя спрэчкі й павучаньні. — Парадкі паўсюль адныя.

— Правільна, — пагаджалася Маро, павярнуўшы вочы да Анто, якому чамусьці зрабілася сумна і бажалася адпачыць. — Сапраўды, нам бы крыху атхланьня. Кано, дзе яно бліжшае на тваіх гонях?

Я ўзрадавалася: вярнуліся да мяне, — і заважнічала, аж дыханьне заперлася: вось так — усё па маім ахоцьці!

— Безумоўна! Кіруй! — падахвочваньне Анто толькі ўзбуджала. — Куды тваё нутро бяжыць?

Каб жа я ведала!

Прыслухалася, як магло, і нічога ня стукнулася. Толькі мільгнулі дзяўчовыя вочы перад расстаньнем.

— Вось яно, аб'явеньне, — адзначыла Маро, спаймаўшы, як я зразумела, маё відмо. — Ад істага. Зноўку душэўнае вынікла і паклікала.

# 14

Сяло паўстала нанава. Здавалася ўсё такім самым, але, уважліва абзерыўшы навакольле, можна было заўважыць адрозьненьні. Дый тхненьне было іншым. Звычайныя натуральныя зьмены, думалася мне.

Успомніўшы апошняе станьнё, я перапалохалася. Шчупальцы ўсталі дыбаром, і хвосьце прыціснулася долу.

— Ну і атхланьне ў цябе, Кано! Вось дык палягчэньне! Прадыхайма, хлопцы! — гульлівыя і жартаўлівыя кепікі Анто трохі распрыжалі варункі, бо тыя здаваліся ўцяжлівымі.

— Насланьнё? Адно і тое ж двойчы? Цяготнае? На гуляньні? — дзіўнымі пытаньнямі сыпала Маро, штосьці паднагадваючы, але страхацьцё адымала ў мяне глузды дый трываньне заканчвалася.

— Досыць вылузвацца і ладзіць хітрыкі! — абарвала я прыяцеляў. — Толькі мазгі затлумляеце замест таго, каб сказаць наўпрост і адкрыта. Я на сваім полі. Калі чагосьці ня ведаю, дык выдатна адчуваю. А вам трэба падказваць і растлумачваць.

— Менавіта так мы і робім, вашае велячэсьлівае, — пашанотнае прысяданьне зьмяніла спохваткі і выказваньні Анто. — А што зараз вам ідзе на адчуваньне?

Хоць і было такое паступаньне крыху іранізаваным, мне яно чамусьці імпанавала. Я запытала:

— А як вашае мудраваньне кваліфікуе вяртаньне да таго, што ўжо было?

— Гэта — надзвычай цікавае пытаньне, — перакшталчэньне зноў лягло на Анто. — Поўныя і ясныя адказы мы можам даць разам з Маро.

— Добра. Пакуль будзем філязафаваць, людзей не наклічам? — і я боязна пырснула шэрымі флюідамі.

— Не, як раней ня будзе. Пачне Маро. Калі ласка.

— Дзякую. Выглядае неяк лекцыйна, — так Маро ахарактарызавала агульнае падрыхтаваньне-прыстасаваньне і прадоўжыла: — Нашае матэрыяльнае Сусьвецьце арганізаванае такім чынам, што ўсё існае ня мае разоў і паўстае толькі аднойчы, то-бок варочацца да ранейшага немагчыма. А калі хтосьці — хамо, мутака, грамадзтва, зьявішча — імкнецца зладзіць адбылае так саменька, у тое ж слова, таго трэба дыягнаставаць і лячыць.

— Вельмі катэгарычна. А вось гэта што? — перапыніла я і паказала ўсім сваім аблíччам на атачэньне.

— Іншае асяродзьдзе. Прыгледзься, Кано!

І я стала пільна ўзірацца. Мабыць, было зусім няўважлівае да дэталяў, бо нічога, акрамя бязьлюдзьдзя, не заўважыла.

— Абставіны тут падобныя, варыянтныя, але больш жыцьцёвыя, — ад Анто выходзілі эмацыйныя, таму і больш пераканаўчыя азначэньні й прыклады. — Тыя, першабачаныя, адваляцца, як сухое вецьце ад дрэва, а гэтыя выцягнуцца ў моцныя галіны зь лісьцямі. Наогул, для лепшага пазнаньня шматстайнасьці быцьця

раю ўяўляць дрэва — і ўсё паўстане наглядна, даходліва. Карацей, зараз мы назіраем іншае, паралельнае сланьнё адных і тых жа рэаліяў, як яшчэ адно сьведчаньне твайго дылемнага мысьленьня, Кано. Проста ўсё крыху зрушана, ссунута.

— Вось узрадавалі! — і я стала сьмяяцца з агляданьнем. — Значыцца, зараз зноў выбежыць галасьлівае дзяўчо, залямантуе, высунуцца карэкі і мяне, крый Баго, яшчэ сілком пажэняць… Што гэта такое? — я і знаць ня знаю. У мяне й жаніла ніякага няма!

Я рагатала да сьлёзаў (адкуль яны толькі ўзяліся!), і спрыяі, бачачы маё істэрычнае калацьцё і хвосьцевае вярчэньне, насур'ёз усхваляваліся: а раптам ад мяне адскокне нешта больш агаломшвальнае і жахлівае?

— До гэтак заходзіцца! — суцяшаючы, Маро выдзяляла блакітныя хмаркі, якія лагодна мяне ахутвалі. Валваваньне Анто таксама было спагадлівым, але насьцярожаным, як бытта яму было штосьці вядомае. — Нам зусім не патрэбна ўзрушэньне. Прымушаць ніхто ня будзе, тым больш наўпроць прыроднага. Міжрасавае злучэньне агіднае і не падлягае ніякаму асэнсаваньню.

— Тагды, веднікі, — абуралася я, — рассейце адурэньне: чаму гэтае дзяўчо палічыла мяне за каханага? Мо на сьвецьці існуюць пары

“мутака-хамо” і ад іх нараджаюцца дзеці? Ці наўпрост ад каханьня вар’яцеюць і кідаюцца на ўсіх прыдатных? Тады што ж гэта за пачуцьцё такое? Га?

— Далей — глыбей, — працягвала Маро і таксама ледзь паварушвала хвосьцем, спакваля зерачы на Анто. — Выйсьце заўсёды ёсьць. Усе адказы ў нас саміх. Шукаюць самаіста, з памогай альбо разам. Нам больш падыходзіць сумесна, бо такое найцікавае стварэньне, як ты, Кано, можа абламацца, калі толькі само. Але на ўзроўнях, дзе мы знаходзімся цяпер, корпацца ўжо немагчыма нават супольна. Значыць, трэба сягнуць на іншыя і праніклівей паглядзець там. Паспрабуем? Табе шанцуе.

— Ачколечы. І што мне рабіць? — я згадзілася адразу, бо прагла пазбавіцца болесных пэрманэнтных праблемаў і стварыць належныя ўмовы для далейшага самаўдасканаленьня. Шчыра, падыспадам ляжала спадзяваньне зрабіцца такім жа ўсяведным і здольным, як Маро. Пра Анто былі іншыя меркаваньні, якія тлумачыліся, пераважна, ягоным дачыненьнем да людзей і Вялікага Пятага Ўвасабленьня — да таго, што ўжо гістарычна адбылося і выглядала непрывабным. Мяне наогул ніякае мінулае не прыцягвала. Мне заўсёды бажалася нязьведанага будучага.

— Напачатку выслухаць, — выказваньні Анто заўжды абагульнялі і змушалі да думаньня. — Уласнае сьвецьце, калі яму не перашкаджаць, будуецца па сваіх законах, у Касмасо ніколі не разбурыцца і будзе існаваць вечна. Збоку яно можа ўспрымацца па-рознаму: узорным, вартым, абыякім, недарэчным, бяссэнсавым… Нават адно і тое ж стварэньне ў розныя пэрыяды жыцьця адражняецца думкамі й правіламі — і як бы мы іх ні круцілі, ні вярцелі, як бы ні аналізавалі, ні сынтэзавалі, ні клясыфікавалі, укупе яны — арганічнае спародзьдзе сыстэмнага, лягічнага і цэласнага аднаго: у вялікім значэньні — АДНАГО, у малым — аднаго. Таму ніякага бязладзьдзя, няўстройства ні ў чым існым наогул няма. Ёсьць індывідуальнае мысьленьне з рознымі поглядамі, падыходамі, якое, нягледзячы на ўсялякія пэртурбацыі, насамрэч пастаянна імкнецца ад недасканалага да ўзгодненага, агульнага, гарманізаванага становішча — да Баго. Так што нашыя ўчынкі, эмоцыі, мысьлі, усякія бачаньні і ўвабражэньні, якімі б дзіўнымі калі-некалі ні здаваліся, заўсёды (!) зьяўляюцца выражэньнем упарадкаванага асабістага быцьця кожнага. Іх трэба разумець і ўспрымаць памяркоўна. Гэта я нагадваю для таго, каб, вандруючы па полі Кано, мы лічыліся адно з адным, думалі і ня лезьлі са сваімі меркамі, былі падрыхтаванымі да ўсяго.

# 15

Крыху заспакоіўшыся ад незвычайнага бязьлюдзьдзя, мы зноўку вярнуліся да надзённага і зірнулі на сяло.

— Магчыма, Кано, гэтае тваё касмасовае адгалінаваньне няблага насычанае сокамі жыцьця, калі, будзьма пакліканае, не сьпяшаецца адчыняцца, чакае альбо занятае чым? — Маро ўглядвалася ў хаты і пакрысе гуляла хвосьцем. — Ці мо гукнеш?

А я было зусім абыякавае і жадала выдаліцца адсюль: ну ніяк не чаплялі мяне гэтыя абставіны! Навошта яны мне? Не падабаюцца! Любое прымушэньне шкодзіць! І чаму я павіннае кіравацца мімалётнымі позіркамі? Колькі ў мяне іх! Процьма! Калі б кожнае варушэньне, лыпаньне вачыма было лёсавызначальным, дык ужо звар'яцела б! Дужа мы спадумлівыя і да дэталяў падазроныя! Трэ быць простымі — так лепей.

— Ты ўжо прайшло гэта і даўно, — заўвагі Анто былі стрыманымі, дарэчнымі і тычыліся майго незадавальненьня. — Засталося толькі рэха. А якое і адкуль? — мы бачым. Табе неабходна яго правільна ўспрыняць і разабрацца, каб пайсьці далей. Між іншым, разьвіцьцё адбываецца далёка не па жаданьні. Спачатку мы напрацоўваем кармічнае, у асноўным прагнучы і па хаценьні, а потым разьвязваем вузлы,

пераважна церпячы і па змушэньні. Ня будзе так — няма й жыцьця.

— Ты, Анто, не палохай, а то ад наўчаньня адаб'еш, — заўважыла Маро. — Памятай, Кано: даецца столькі, колькі можна вытрымаць. А ты ў нас дужае, і несьці табе — не стаміцца!

— Дзякуй! — ірмілася я, адчуваючы сваё значэньне, і ўжо намервалася крыкнуць на сяло, як раптам яно само абудзілася настраёвым граньнем.

Мы пераглянуліся і рушылі да забаваў.

# 16

— Вясельле! — маўклівае засяроджанае пазіраньне Анто раптоўна зьмянілася гучным зьдзіўленьнем. — Найцікавейшае людзкое мерапрыемства! Сьвята сьвятаў! І хто тут пабраўся?

Я ведала пра сужэнства і шлюбныя парадкі карэкаў, не разумела іх, але захаплялася, што лучэньне двух істотаў праваджаецца такім цудоўным і прыгожым гуляньнем. Нам, мутакам, такога не хапала: адно — бачыць суджанкаў і ўсіх радаснымі ды пазорнымі, другое — зецiць дадаткова да гэтага яшчэ і рэальнае, сьлічнае выяўленьне гэтага агульнага шчасьця.

— Але, калі б настроі і выразы людзей былі тольма станоўчымі, — разважала Маро, — дык мы былі б іншымі і жылі б пад райскімі шатамі.

— Сьвядомымі альбо несьвядомымі? — удакладняльнае пытаньне Анто прагучала неспадзеўна, па-філязофску глыбока, нагадаўшы пра першапрычыны зямнога разумовага паходжаньня й існаваньня ўвогуле, але абставіны не дазвалялі абстрагаваньня і фантазіяваньня.

І ўсё адно ў маім сьведам'і бліснула: да веданьня, хто мы, адкуль пайшлі і чаго вартыя, імкнецца кожнае стварэньне кажначасна і ў любых умовах; іншае — як гэта выглядае і як выражаецца.

Маро і Анто зірнулі на мяне, усьмешліва кіўнулі галовамі і сканцэнтраваліся на вонкавым.

Вясёлае і шумнае зборышча па-заліхвацку гудзела, танчыла, сьпявала, пярэсьцілася, уцягвала ў сваё віраваньне ўсіх мінакоў.

Ад гулявізнаў да нас таксама несьліся прывітаньні й запрашэньні, якія хутка перарасьлі ў настырнае чапляньне.

Я хвалявалася, што возьмуцца зноўку за мяне, але скакухі, гіцуючы вакол, выбралі Анто і заўзята піхнулі яго ў абдымкі да аднаго вельмі радаснага стварэньня. Тое адразу імпэтна і юрліва прыціснулася, двухсэнсоўна круцячы сваім гузном.

На нашае задзівеньне, гэта Анто не засмуціла, а, наадварот, узбудзіла і кінула ў жарсныя скокі. "А што тут стыдацца? — петрыла я. — Свае ж!"

Але ўсё абярнулася інакш.

— Як цудоўна! Нездарма сэрцайка трапятала! На вясельле клікала! Да свайго шчасьця! — прыгаворвала арыё, забыўшыся на танцы і ўсё шчыгульней тулячыся да Анто. — Дачакалася!

— Ната? Скуль ты? — подзівы захапілі Анто.

— Дзе ты, там і я, — прыгожа сьмяялася хамо. — Мілосьнікі мы! Даўнютка не страчаліся, — і ўсё зазірала ў вочы.

— Што было, тое сплыло, — нечаканыя рэзкія словы Анто апарылі гуляньнікаў, і яны перасталі скакаць.

— А як жа пачуцьці? — разгубілася разгарачанае стварэньне пасьля ветлага аслабаджэньня Анто ад абдымкаў.

— Адышлі.

— І..?

— І ўсё да іх прылучанае!

— А мае жывуць. Я толькі і думаю што пра цябе.

— Выбачай, я — не.

— Хіба так бывае? Калі кахаеш, дык і думаеш. Значыцца, каханьня не было…

— Атрымліваецца, хоць мяне вабіла да цябе…

— Нешта іншае цягнула… мімалётнае, няўдумлівае…

— Мабыць… Я дзякую табе!

— Я таксама. Толькі што з таго? Як быць далей? Пачуцьці астынуць. А думкі?.. Куды зь імі?

Ната сумна паглядзела на Анто, уздыхнула, адвярнулася і ціха пакрочыла прэч.

Нашае друхно не пабегла сьледам, не запыніла і наогул анічога не зрабіла, каб неяк зьменшыць агульнае бедаваньне.

Пра тое, што ўсім сьведкам гэтага спатканьня было гаротліва, сьведчылі цёмныя і густыя хмаркі над галовамі.

А вясельле не зважала і па-ранейшаму сьвяточна бурапеніла.

# 17

— Жорстка, — сказала Маро, цікаўна глядзячы на Анто. — Так са сваімі каханкамі абыходзяцца ўсе арыйскія адэпты?

— Менавіта, — вочы Анто кружлялі па баках, угору, уніз, і было відаць, што яму неахвота гаварыць аб гэтым, а тым больш — паказваць сваё хваляваньне, хоць я і Маро заўважалі ягоныя выпарэньні. — Вось так: ня ведаеш, дзе ад цябе адыдзе, а дзе прыбудзе… Вучыся, Кано, і ніколі не пераймай звычкаў людзей, ня вер ніякім іхным клятбам, нават калі перад табой апекуны: заўсёды падмануць. Ня мае значэньня як: добраахвотна, змушана, абыякава. Гэта іхняе прыроднае — хавацца, маскавацца, таемнічаць. Калісьці, каб ураўнаважыць і зрабіць іх годнымі для Касмасо, ім далі каханьне: яно, маўляў,

разьнявольвае і ашчырвае. Але надзялілі толькі цераз пачуцьці. Розумы вырашылі не кранаць. І што атрымалі? Большых бязглуздых, чымся заканых, няма на сьвецьці. Кармічна яны атруцілі і вашыя шляхі, паважаныя мутакі. Так што не задавайцеся: не такія вы ўжо і пухнаценькія. І да зораў пойдзем разам! Іншае: ці чакаюць нас там? Мо скасуюць, як няздатных?.. Вось і мяркуйце, хто такія адэпты ад карэкаў і якія іхнія правілы… Дазволілі разгаманіцца, лепш бы болей паспыталі чалавечага вясельля… Вунь, як яно захапляе!

Але мы, уражаныя сардэчным аб'явеньнем Анто, ні на што не зважалі, унурыліся ў сваё і маўчалі. Мне зноўку стала безразрожліва і пацягнула да сваіх. Не бажалася аніякіх людзкіх умоваў і асаблівасьцяў. Я ўсё больш пераконвалася, што гэта — аджылае і нікому не патрэбнае мінулае, якое нават нябёсы нішчаць разнастайнымі канцамі сьвецьця так, каб і паміну ніякага не было. А мы тут высільваемся, вывучаем! Трасцаў вам! Не жадаю!

Як на тое, у навакольлі раптам нешта адбылося, бо вясельле заціхла і кудысь утаропілася. Мы таксама павярнулі галовы і зьніякавелі.

Сонечнае і блакітнае неба спачатку зьмянілася на брудна-шэрае, потым пакарабацілася і пачало драцца на ласкуцiньне, якое тут жа тлела і ўвачавідкі зьнікала. Уверсе пакрысе ўтваралася і разрасталася чорнае бяздоньне.

Вясельле хутка калыхнулася, панічна замітусілася, залямантавала і пабегла.

Толькі цяпер я пабачыла маладых. Прыўкрасныя, але сжахнутыя, яны імчалі ўзяўшыся за рукі да землянога накрыцьця, што было воддаль. Нешта шчымлівае ёкнула ў маіх грудзях. Адно стварэньне было паперадзе і падалося знаёмым (адкуль?), другое крыху адставала, спатыкалася, мятушліва зіркала па баках. На нейкае імгненьне нашыя пагляды стрэліся — і мяне торгнула ізноў. “Юлё? Вось табе і каханьне!..”

— Трэ і нам ратавацца, — данесьліся да мяне словы Анто, і мы сьпешна ўключылі разумовыя арыенціры, хуценька сягнуўшы за межы матэрыяльна-часоўнага страсеньня.

# 18

— А што было б, калі б мы засталіся? — пацікавілася я, як толькі зноў распасьцёрліся зорныя прасьцягі.

— Калі гэтае адгалінаваньне зьнікла, прапалі і мы, як прабывалыя ўнутры, — даводзіла Маро. — А калі яго крыху пашкуматала і яно яшчэ ліпіць, мы пакуль ацалелі, але апынуліся ў незайдросным становішчы, — прыяцеля хітравата паглядзела на Анто.

— Так, — тлумачэньне Анто было ўдумлівае, — затым нас, як чужынцаў, адразу зрабілі вінавай-

цамі і пасьля жорсткіх катаваньняў, хутчэй за ўсё, прылюдна пакаралі.

— Вы так дакладна й лёгка распавядаеце, як быццам усё гэтае звыклае і ўжо адбылося, — абуралася я падыходамі. — Нагрувасьцілі нешта бессэнсоўнае: мы ж жывыя, размаўляем…

— … альбо сьведчым яшчэ адно прасторавачасоўнае прытымбыцьце, — нясьпешна працягвала Маро. — Кано, мы намерваліся абмеркаваць гэтае пытаньне апасьля, а калі ўжо яно ўзьнікла, то слухай.

Сябро, свабодна лунаючы і назіраючы нябёсныя відовішчы, гаманіла нібы ў трубу — і ўсё наўкола галсчэла:

— Мы з Анто нездарма ўжываем параўнаньні і азначэньні, блізкія да расьлінаў, бо імкнемся прызвычаіць цябе ўспрымаць Сусьвецьце як дрэва. Малое й вялікае, мікра й макра, рэчы й зьявы — усё ў Касмасо ўладкаванае філямэнтальна і падобнае да дрэва. Мы, індывіды, паўстаём як камлі, галіны, вецьце, лісьце, плады ў суцэльным і асобным значэньні, то-бок разьбягаемся па прастаро й часо ды нагадваем клетачнае ўстройства, якое існуе ўзаемаабменна. Нас шмат. У адным мейсцы зелянеем-сьпеем, у другім — ссыхаем-адпадаем, але ўсё адно жывём вечна. Зразумела? Так што, калі ўзьнікаюць праблемы — уяўляй дрэва, мазгуй, і выйсьце прыйдзе.

Я ведала пра адзінства ўсяго прыроднага, узаемалучэньне, але ня так наглядна, відзебна й вобразна, як падало Маро.

— Тады атрымліваецца, што пройдзенае вярнуць зусім немагчыма, бо кожнае імгненьне своеасаблівае і не паўтараецца? — я навучалася экстрапаляваць працэсы і тым самым высьвятляць, ці слушныя некаторыя мае здогады.

— Канечне, — гарачыя і прыгожыя флюіды цяклі ад Анто, і ягонае жаданьне падзяліцца думкамі было неверагодным. — І менавіта ў гэтым — непаўтарэньні, неўзнаўленьні, ноўстве — найвялікшае шчасьце ад быцьця. Ніколі ня трэба спыняцца і задавольвацца дасягнутым. Толькі наперад! Нават цераз пачуцьці! Прэч ілюзіі!

— Дык тыя падзеі, удзельнікі зачыніліся насаўсім? — я ўсё ціснула на сваё спакойна, але прыяцелі заўважылі над мяне гаротныя балачынкі.

— Чагой-та ты забедавала? — Маро нахілілася і ўлашчыла дыханьнем. — Такімі прыкрымі былі абставіны і раптам — шкадаваньне... Турбуе што?

— Не, — адвярнулася я, але хвосьце выдала маё хваляваньне.

— Кажы, не стыдайся, — мяккія і лагодныя дотыкі Анто абуджалі ўнутры штосьці нязнанае.

— Ад маіх думкаў не адыходзяць вочы і позіркі таго стварэньня, — прызналася я і словам, і дрыготкімі шчупальцамі. — Першае разо

лямантавала, а другое — заручалася... Юлё. Такое жыцьцё. Няўжо загінула? Жаласьліва... І я вінаватае, не дапамагло...

Маро і Анто са зьдзіўленьнем пераглядаліся. Ці наўрад яны ведалі, што рабіць, бо доўга маўчалі. Я толькі адчувала, як глыбока і інакш яны разумеюць адбывалае, бо паветра вакол іх ніяк не вагалася.

# 19

— Можна! — неакрэсьлена мовіла Маро пасьля задуменьня, і мы памкнуліся да яго. — Але няпроста. Звычайна для таго, каб трапіць да патрэбнага вымярэньня, нам дастаткова этэрна настроіцца, таргануць адпаведныя касмасовыя ніткі і сягнуць. Аб'екты зьявяцца праломленымі праз нашае сьведам'е. Па-сапраўднаму, яны іншыя. Ёсьць колькі варыянтаў, але абмежаваных і таёмых, якія дазваляюць уяўленьню больш-менш аб'ектыўна аформіцца па жаданьні. У асноўным яны даступныя сама высокаму касмасоваму разьвіцьцю. Мы пакуль не такія. Табе, Кано, як патэнцыйнаму пасьвячонаму, можна паспрабаваць так званага прамога двухбаковага лучэньня. Яно магчымае толькі, калі існуюць прымальныя агульныя сьвядомыя сьляды адно аднаго, ці тое, каб вас лучыла аднароднае памкненьне. Ёсьць яно?

Я разгубілася, бо не магло сцьвярджаць пра нешта парнае між мною і Юлё. Як разглядаць апошнія выпадкі? Змушаныя і выпадковыя кантакты. Прыцягальныя? Не. Хутчэй адпіхвальныя… А Юлё? Сьпярша гарнулася да мяне, а потым кінулася ў замужжа зь іншым… Нічога аднолькавага, усё рознае. Што ўжо казаць пра вонкавае непадабенства!

— А вашыя мімалётныя позіркі? — напамінаньне Анто зрушыла думкі, і я запытальна паглядзела на Маро як на збавеньне.

— Вось за гэтае льга зачапіцца, — ажывілася Маро, — і праверыць, ці напяліся паміж вамі хоць якія струны.

Яно сканцэнтравалася, трохі паманіпулявала рукамі і радасна гукнула:

— Ёсьцека! Ніткі памятаньня і хваляваньня. Пацягнуўшы за іх, можна наблізіць вобразы. Абнадзейвае і тое, што каханьнем адаміта бачыць цябе, Кано, глыбока і пранікае амаль да твайго наўмянальнага асяродзьдзя, не заўважаючы ўвасабленьняў у розных сьветах.

— Значыцца, ня зглузьдзіла, а прасякла неўсьвядомлена, ня ведаючы, — разважала я, узгадваючы першае спатканьне. — Своеасаблівае затлумленьне. Няўжо пачуцьці так далёка вядуць?

— Да наўмянальнага? — дзіва ахапіла і Анто. — Ці наўрад.

Тады што?

Гэтае пытаньне ўзьнікла ўва ўсіх адначасова і выразілася над кожным іскрыстымі промнямі, скіраванымі ўвысь.

І нас пацягнула туды. Мы паімчалі. Мною ўсё мацней авалодвалі адчуваньні, якія нагадвалі зямныя дзіўнасьці, і я зь цікаўнасьцю зыркала на кампаньёнаў. Тыя вонкава нічым не выяўляліся, і мне рабілася неяк не па сабе: што адбываецца?

# 20

Наперадзе захаморылася, імгненьне-другое — і перад спагляньнем паўстала лясіста-пагорыстае навакольле, там-сям як панатыканае разнастайнымі хатамі.

Праясьнілася, але лёгкае засмужэньне засталося.

Мяне несла да аднаго збудаваньня сярод бухматых дрэваў. Маро і Анто паадсталі, але ўсё адно мы размаўлялі без напружаньня.

— Чымсьці яно цябе вабіць, — угляданьне Анто ў атачэньне было цікаўным і праніклівым. — Непадобна да наўмянальнага. Кано, што ты адчуваеш?

— Чагосьці бажаецца, нават вельмі, — глыбока дыхала я, пачынаючы вылучаць ружовыя флюіды.

— А нам дык нічым і ня тхне, — прамовіла Маро, пазіраючы на спакойныя аўральныя аб-

рысы Анто. — Гэта азначае, што зайсьці ўнутр дазваляецца выключна табе, таму мы застаемася тут, а ты сягай. Не турбуйся, усё будзе добра, памятай: на сваім полі гаспадарыш ты! Посьпехаў!

Я толькі падумала, што рабіць, як дзьверы расчыніліся. Мімаходзь сярод рознага пырхнула: дзікунства! навошта запірацца? у мутакаў такога няма.

Вонкі мелася выйсьці голае адаміта, але, стыкнуўшыся са мной, асалапела і адступіла назад. Яму было цёмна і не відаць. Я ж бачыла ўсё выразна, нават калярыстыя выпрамяненьні ягонага цела, але ад нечаканага таксама зьбянтэжылася. Больш за ўсё мяне ўразілі шырока расплюшчаныя вочы: бытта на мяне ўтаропілася Юлё. Адкуль? Чаму? Няўжо ад хваляваньня ўсе людзі аднолькава глядзяць? Ня можа быць, каб так буяла аднастайнае — гэта супярэчыць усім законам! Назьдзіўна яшчэ і тое, што перада мной стаяла мужчынскае стварэньне.

Нечакана нешта рыпнула, і да нас выйшла другое аголенае хамо, ужо жаноцкае. Я ледзь не абамлела, калі яно нагадала мне маладога на мінулым ажаненьні: такое ж прыцягненьне і настраёвае гуляньне нутра.

І я зрабіла абагульненьне: ад узрушэньня ўсе людзі аднакія і спаверху, і ўсярэдзіне і могуць зьмяняцца плоцева — а мо гэта тольма маё

ўспрыманьне? Для пацьверджаньня трэба пацікавіцца ў настаўнікаў.

Абодва не засаромеліся — а мне распавядалі адваротнае, — абняліся і выйшлі для патрэбнага. Я пакрыўдзілася: яны што, мяне да жывёлаў прылічаюць? Ну, пачакайце! Я вам пакажу!

Вярнуліся таксама галыя і адразу кінуліся ў абдоймы, сталі наўзацмачкі цалавацца, як быццам мяне і не было. Іхныя рухавыя целы спляліся і склалі адно жыватроплівае жарснае ўтварэньне, характэрнае для дзьвюхплоцевых у моманты запачацьця нашчадзтва.

Я неаднойчы бачыла людзей у моманты спароўваньня і ўспрымала тое як звычайнае выкананьне імі фізыялягічных функцыяў падаўжэньня жыцьця, і спачатку не разумела, чаму яны так цягнуцца, імкнуцца рабіць гэтыя акты проста так, бяз думкаў аб спадкаемцах. Потым да мяне дайшло, што тыя трымаюцца на прыемных адчуваньнях, цялесных насалодах, на ўсім любаярлівым, то-бок на тым, чаго так не хапае людзям.

І я па-іншаму паглядзела на іх: адначасова шкадавала і пахічалася; мяне ўразіла драматычнае, нават трагічнае, прызначэньне адамітаў. Нябёсы, каб споўніць нейкія невядомыя нам пляны, разьдзялілі сваіх стварэньняў напалам, даўшы ім толькі адно вартае лучэньне — плоцевае, якое суправаджаецца задавальнень-

нем — чуцьцём, мізэрным у зямным сьвецьці й вялікім у многіх іншых. Людзі інтуітыўна ўспрынялі такое дзяленьне несправядлівым, крыўдна-ашуканцкім і апантана ўзяліся за выпраўленьне, якое ўбачылі ў нястрымных прыемных фізычных сукупленьнях, замест таго каб пакорна прыняць дадзенае звыш і ўгамавацца. Бяздумнае памкненьне людзей да салодаснага, распуснага і юрлівага існаваньня спрычыніла згаршэньне і занядбаньне галоўнага прыроднага пакліканьня — нараджэньняў, памножыла радавыя заганы. Кольkаснае пераважыла якаснае. Калі напачатку хомы прытрымліваліся навязаных ім абавязкаў размнажэньня, інстынктыўна ды неразважна пладзіліся і ў тэмпэрамэнтным адурэньні шанавалі сваіх нябёсных даўцаў, дык апасьля ўсмакаваліся, затлумілі мазгі блудадзействам і адпрэчылі багалюбства, сказіўшы само паняцьце дзетараджэньня.

Творцы вялікага і малога, памятайма: усе ідэі дэтэрмінуе аргазмавае забыцьцё!

Такія сподумы зіхнулі ў тыя імгненьні, калі я змушана назірала за бязульствам чалавечых асобінаў.

Адразу было непрыемна, валодала агідзьдзе, і я па-ўсялякаму кешкалася, каб мяне заўважылі і спыніліся. Але мілосьнікі захапіліся, горача і ўставічна цалаваліся, прагна дыхаючы, ірміліся

аж покуль не ўспалымнелі і ня ўзьюрыліся. Абодва былі ўродныя, прыгожыя, лёсыя. Кванты вакол іх гулялі і зьвінчэлі.

І штосьці паўзьдзейнічала на мяне. Асабліва, калі каханкі зьвіваліся-вызьгібаліся, датыкаючыся рукамі й вуснамі адно аднаго, кунежыліся, зьмяняліся абліччам. Мужчынскае рухавае й жылістае адросьце, уздрыгваючы, павялічылася, скалавацела і высока паднялося. Жаночае цела памкнулася да яго і, віхляючы гузном, наблізілася ўстык. Як тольма іхныя харужы пачалі злучацца, навакольле завібравала, і я ўпершыню адчула невымоўнае музычнае галсчэньне, якое рабілася ўсё больш мілагучным ад сумесных жарскіх тактаў. Пругкае й крэпкае сьцябло ўглыблялася ў пульхнае й сакавітае лоньне то мерна, то напорыста, то кружляючы, то з затрымкамі — і гэта ўлучна з палкімі ўздыхамі, хаканьнем, сапеньнем істотаў спараджала ў паветры імклівыя імпульсы-фантомы, падобныя да ўчэпістых зданяў напачатку маіх прыгодаў.

Мяне забрала відовішча, і я ўжо не ўсьведамляла, якое магутнае энэргетычнае запатрабаваньне жыцьця вывергнулі ў касмасо аргазмавальныя плоці каханкаў і якім было маё роспачнае страсеньне, калі тое засталося без задавальненьня, а я ўбачыла ў Сусьвецьці більёны такіх жа марных інтымных запытаў, асуджаных

да забыцьця, у асноўным з-за іх фізычнага зьнішчэньня ў пасьцелях дзеля забаваў.

Мае прыяцелі знайшлі мяне поруч з маладымі адамітамі, кволымі і пяшчотнымі.

# 21

Калі мы зноў апынуліся ў міжзорным бяздоньні, доўга маўчалі. Зецілі вечнае, упарадкаванае, сэнсоўнае. Малое ў вялікім. Рознае ў аднакім. Несумяшчальнае ў зьмесьлівым. Думкамі створанае. Якія яны, калі вакол такое! Ці дасяжныя разуменьню?

Я адчувала, што Маро і Анто шырэй глядзяць на мае дазнаньні, не сьпяшаюцца кранаць мяне, вытрымліваюць, чакаюць пасьпяваньня. Спачатку трымцела фібрамі, унікаючы й пераживаючы, а потым сукоілася, даверылася натхненьню.

І яно прыйшло, таўхнула да абуджэньня. Неяк адразу ўзбадзёрыла, закарцела, паклікала.

Мабыць, мы прывыкалі да паломніцтва, бо далей адправіліся з радасным прачуцьцём, хоць мяне непакоіла маўчаньне настаўнікаў наконт, як кажуць карэкі, сэксуальных паводзінаў.

Бязьмежжа пад намі праясьнілася і намалявала возера ў атачэньні ўсякіх сядзібаў, густа засаджаных дрэвамі. Я не магло патлумачыць, якія мэханізмы спрацоўвалі, калі адчыняліся

канкрэтныя спазоры, бо ніякага навігацыйнага прыстасаваньня, акрамя глуздоў, у мяне не было, але рабіла заключэньне аб агульным падабенстве выяваў і людзей. Значыцца, вадзілі мяне не для пустых аглядаў і хаатычна — абы паказаць! — а абдумана, сэнсоўна, мэнанакіравана, чаго дастаткова не ўсьвядамляла, як і таго, што, акрамя настаўнікаў, мною рупіцца яшчэ нехта.

Маючы экзыстэнцыйныя, ірацыянальныя ўяўленьні, я разумела ўсё гэтае па-філязофску, спакойна, але ніяк не магло пазбыцца запытаньня: якія часы мы наведваем, чаму тубыльцы прымаюць нас не за прыхадняў, а за тутэйшых, безь зьдзіўленьня? А што друхны не зважалі на тое, бянтэжыла ўдвая.

# 22

Новае паселішча ўспрымалі зьверху, не заўважаючы нічога такога, што б чапляла. Прыяцелі касабочыліся, пераглядваліся.

Я моўчкі, няўзрушна глядзела ўніз і, забыўшыся, лена гуляла ўвабражэньнем.

— Кано! Ачуйся! — пстрыканьне Анто абудзіла. — Стамілася?

Атрымліваецца, лянотаю можна празяваць-занядбаць пакліканьне.

— Не! — уздрыгнуўшы, чапорылася я і запускала шчупальцы.

— Тады прыслухоўвайся.

Нейкія імпульсы лягалі навокал, але мяне не кранალі і бытта не заўважалі. Ну, і я было абыякавае: не маё гэта. Наогул, я прыкмеціла, што прызначанае заўсёды адбываецца своечасова і дарэчы, падганяць яго ніколі ня трэба. Там усё вырашанае. Вось бы пабачыць сваіх зычліўцаў! Парадзіцца зь імі!..

— Прыйдзе часо — сустрэнеш, — строга мовіла Маро, нагадаўшы пра нязаскрытыя каналы.

Так, я дужа захапілася і адвалаклося. Трэба быць уважлівей.

Тут жа зьлёгку стала паторгваць, і я накіравалася да невядомага хваляваньня. Яно ішло ад прыгожага драўлянага жытла, вокны якога праменілі і сьвятло, і натханьне.

Толькі я памкнулася вонутры, як дзьверы расчыніліся і прагучала запрашэньне:

— Калі ласка, заходзьце!

Ахопленае зуменьнем, я ўвайшло і апынулася наўспроць двух сьлічных і ўсьмешлівых стварэньняў. Адно зь іх зьзяньнем вачэй зразу напомніла Юлё, другое радасна-спадзеўным міганьнем павекаў кінула да трапяткіх імгненьняў вясельля. Што такое?

— А мы якраз абмяркоўвалі: зазірне да нас ці абыдзе? І вось… — не даючы апамятацца, вышэйшае прыязна раскінула рукі і ступіла да мяне.

— Мы сапраўды рыхтаваліся, чакалі, — залюбкі і міла запрашала ніжэйшае. — Не стыдайся, праходзь.

Я зрабіла колькі крокаў, спынілася, аглядаючы хатнія прыборы. Усё было акуратнае, дагледжанае, спраўнае і разам са стройнымі, прыхарошанымі гаспадарамі выклікала замілаваньне.

— Любаценьне! — не ўстрымалася я, адчуваючы, як насамрэч мне ўтульна й раскошна.

— Пазнаёмімся. Я — Калё, гэта — Юсо.

— Мяне клічуць Кано.

— Мы вядзём паспольнае гаспадараньне, — словы Калё йшлі ўпярэмежку зь цёплымі позіркамі на Юсо.

— Зусім нядаўна, — дапаўненьне Юсо было крыху пасьпешлівым. — Яшчэ добра й ня звыкліся.

Затым хамо нечакана змоўклі, нібыта атаропелі, і адвялі вочы ўбок.

— Мы доўга дзевавалі, — было бачна, што Калё перамагае засаромленьне. — Але аднаму заўсёды цяжка, і мы вырашылі сысьціся.

— Нешта падказвала, што так трэба. Усё-такі разам весялей, — радаснае ажыўленьне Юсо зьняло напружаньне, да таго ж і я вонкава выражала свае добрыя пачуцьці.

Усталявалася памыснае, дагоднае ўспрыманьне.

Мяне ўсё не пакідала насланьнё, і я вырашыла дазнацца:

— А скуль вы зналі, што я прыйду?..

Задзівеньне сугасподнікаў было аднолькавым, і яны пераглянуліся.

— Было веданьне, што будуць госьці.

— Ад каго?

Яны паціснулі плячыма, зірнулі адно на аднаго.

— Як звычайна.

Я няўцямна пазірала і, мажліва, нагадвала звар'яцелага, бо не магло даўмецца. Глузды кіпелі, адразу перапрацоўваючы мноства варыянтаў тлумачэньня, але не знаходзілі сама пераканаўчага, і, каб ня схібіць, я спынілася на банальным і зьвярнулася да Калё, ад якога йшлі адказы:

— Вам паведамілі?

Яны яшчэ больш разгубіліся, замітусіліся, не знаходзячы ніякіх словаў. Неаформленымі таксама былі й іхныя адчуваньні. І я ад неўразуменьня, каб выправіць становішча, ціха запытала:

— Гэта таёмае, сакральнае?

— Кано! — пранікліваe суцяшэньне пацякло ад Юсо. — Нам трохі ніякавата, што няздольныя адказаць табе. Такія мы. Ты адтуль, іншае і можаш… Калі ёкнула чарговае натханьне, мы з Калё вельмі ўзрадаваліся, бо яно было асаблівым, зразумелым, бліжэй да нас. Думалі, нарэшце і да нас прыйшло сьвята. Але…

Раптам гучна расчыніліся дзьверы, і ўнутр уварвалася ўзбуджанае хамо. Вялікімі агнёвымі вачмі яно адразу выхапіла мяне й аблегчана ўздыхнула.

— Вось, яно тут! Прыстойнае! Цяпер і вам, красухі, пашэнціла. Віншую! А мы аббегаліся шукаючы. Усё местачка абшнырылі. Ужо дамовіліся? Не? Не гарачыцеся! Тут трэ добра пагаманіць. Іншых угледзінаў ня выпадзе. Ну, бывайце! А я скокну надвор, да паважатых. Нашыя ад іх не адстаюць. Будзе ім па самае годзе. Без абяцаньня іх не адпусьцяць.

Дзьверы ляпнулі, аж збудаваньне ўздрыгнула. Гаспадары таксама скалануліся і пад лёгкае ўстхненьне павярнуліся да мяне.

# 23

— Гэта — Лаўро, — нейкае спахоўнае і глыбокае ўражаньне не пакідала Калё, хоць вонкава выражалася іншае. — Яны з Баро жывуць па суседстве, доўга былі бабылямі, бабахотамі, гарцалі зь дзеўкамі, маладзіцамі як апантаныя, усё было мала і станьком. Нас падбівалі да сарамацьця. Больш пільнавалі Юсо. Але сюды ня зь іхнымі мазгамі заляцацца. Я адшывала адразу. На чорта мне блудадзейства, пустое юрэньне! Ня петрыш — адвалі! Юсо трохі гулялася, але заўсёды кеміла, што да чаго, і таксама адпрэчвала ўсялякія жадлівыя забегі. Урэшце, нас так і не ачмуцілі. Не знайшлося панятлівага і моцнага нутра, каб зьліцца. А пачуцьці? Ёсьць галовы — будуць і яны. Песьні можна і мармытаць, і на словы сьпяваць.

Юсо слухала і момантамі кідала двухсэнсоўныя погляды то за вокны, то на мяне. Перапыняць, спрачацца ня мкнулася, чакала і ўрэшце, наважыўшыся, дапоўніла:

— Яны таксама не адразу злучыліся, жылі зладнага паасобку. Цікава, што насур'ёз ні да каго не хіліліся, толькі балбаталі пра ажаненьне, але так ні з кім і не пабраліся, хоць некаторыя чакалі. Казалі ўсякае. Цяпер вось разам. Дужыя, жыльныя. Хто там за галоўнага? — цяжка сказаць. Нейкія яны аднолькавыя, не камандуюць, адно аднаго слухаюцца, па баках яшчэ зыркаюць, але бязглузда. Да іхнага бабылства цягаюцца такія самыя з усяго ваколья. П'юць, лаюцца, б'юцца. Атрымліваецца: пачуцьці стапталі, а ў мазгі не абуліся. Каму патрэбнае такое жыцьцё?

— А нашае? — падхапілася Калё.

— Годнае. Вось жа: прыбылі да нас! — настраёва адказала Юсо і паважліва, ветліва павярнулася да мяне.

Я слухала, успрымала, але ніяк не магло дайсьці, што адбываецца ў гэтым местачку, і чаму нашае прыбыцьцё выклікала ўсеагульнае ўзбуджэньне? Як яны дазналіся пра нас і чаго чакаюць? Таму запытала зноўку нэўтральна:

— І што ад гэтага?

Карэкі пераглянуліся, і Калё мовіла:

— Калі касмасовыя выклікі будзяць, штурхаюць нас, мы ўсе ведаем, што да кагосьці прыйдзе

нехта адтуль, — і, націскаючы на апошняе слова, рукамі пакруціла ў прастаро, — і ў жыцьці таго адбудуцца вялікія зьмены — гэта здарэцца рады ў гады і зьяўляецца этапным для ўсяго нашага сьвецьця: колькі гісторыяў, легендаў і баек складзена, навукоўцы вывучаюць! Апошняе такое здарэньне было зь дзесяцігодзьдзе таму. У іншых месцах — і таго радзей, да сталецьцяў сягае. Вам, гасьцям, невядома, як уплываюць такія падзеі на людзей, як мы іх чакаем і якімі думкамі жывём. Існуем як запраграмаваныя на стацьцё, як заложнікі чыйгосьці сьведам'я і прызваленьня. Сама галоўнае, што прадвесьціць, запаведаць нічога нельга.

Я заўважыла, як цягам тлумачэньня зьмянялася вонкавае і ўнутранае аблічча маіх сумоўцаў і як спадзеўна яны глядзелі на мяне.

— Табе цяжка зразумець нашае становішча, — хвалявалася Юсо. — Яно цалкам залежыць ад цябе, ад тваіх мэтаў. Ёсьць шмат вэрсіяў, чаму да нас прыходзяць і ніколі не застаюцца, а тым больш не вяртаюцца. Усе яны зводзяцца да аднаго: мы ні для каго не цікавыя, не патрэбныя, выракчоныя, таму што варыянтныя. Такіх вымярэньняў безьліч. Хтосьці памазгаваў — мы атрымаліся, яшчэ напружыў думкі — разьвіліся, перадумаў — прапалі. На ўсіх адно немінучае — зьнікненьне, ці бо мы — сьвецьце бяз будучага. Зьлічво асуджаных на быцьцё існуе, але яно

невялікае. Увогуле, нас няма! Непрыкаяныя фантомы! Так што, Кано, цяпер вакол цябе пуста. Цікава? Ты б жадала такога наканаваньня?

— Не! — амаль выгукнула я, уражанае ад гэткага канкрэтнага і жудаснага сьведчаньня існага.

— Шчыра, — назіраньне Калё было праніклівым. — Але не хвалюйся. Ты ўжо ёсьць, а вось мы пад пытаньнем. І вырашаць табе.

Я разгубілася і ня ведала, як паводзіць сябе, ад расчуленьня хістала целам, кудлаціла валасы, шчупальцы, матляла хвосьцем. Арыё моўчкі пазіралі, трывожыліся.

Настаўнікаў я не адчувала і нэрвавалася яшчэ больш.

# 24

Бязмоўе было кароткім і крыху сукоіла, даўшы вольнае для думкаў. Я ўбачыла асаблівае гуляньне квантаў над Калё і, пацягнуўшыся да іх, нырнула ўглыбкі. Маё істае пачало расьцячацца.

— Кано, — ад яго ішло збавеньне, — мы цябе не прымушаем і не вымольваем лёсаў. Да свайго прызвычаіліся і ўспрымаем як дадзенае. Так склалася, што нашыя шляхі перакрыжаваліся. Значыцца, нехта альбо загуляўся, альбо пацяшаецца. Калі нішто не таўхае — не гвалтуй сябе, спакойна

ідзі далей. Папракаць ня будзьма, дый бяссэнсава гэта. Усё адно нас двое, а выбіраць табе мы не дамо. Так, Юсо?

— Менавіта! — адказала тайко.

Цяплей вачэй за гэтыя я не страчала, як і такога спляценьня абдымкаў.

Можна было ня рупіцца і адступіць, як раней, але нешта невыразнае трымала і не дазваляла адхлынуць. Мабыць, адзабыль я загулялася і не адважвалася шчыраць: сябелюбства — моцнае ліха.

У сенцах нешта загрукацела — і ў памяшканьне ўрынуліся Маро й Анто.

— Мы працягла адбрэхваліся ад назолаў, — у Анто атрымлівалася ўжываць трапныя азначэньні, — а ты яшчэ даўжэй дудукаеш і, відаць, так нікога й не падужаў! Дзіцё ты нашае! Давай мы палацьвім твае намогі!.. Ах, якія лёсыя арыё!

Усе сачылі за яго выкрутасамі і ніяк не рэагавалі. Праз імгненьне, калі патыхнула іншым, да яго прыйшло новае натхненьне.

— Грунтоўна ўскрышылі й засеялі канод-нае, — ягоныя думкі перабіралі сутнае ў атачэньні й вызначалі прыналежнае да канкрэтных асобаў. — Цікавыя палеткі атрымаліся: быццам бы розныя, а збожжа адно расьце! Вось чаму вы забарыліся: баіцеся, а мо ня ведаеце як, разам ураджаі зьбіраць.

Мы слухалі, унікалі і за мэтафарамі бачылі нешта лёсавызначальнае і вельмі добрае. Сьвятлела й цяплела на сэрцах. Але здогадам ніхто пакуль не асьмельваўся даць правільнае і дакладнае выражэньне.

# 25

Яно забруіла ад Маро, якое таксама ўважліва ўслухвалася ў паветранае гучаньне.

— Цябе, Кано, ветнымі вехамі водзяць, — у яго нават алітэрацыі ўзьніклі, — і гэта змушае ўспрымаць нашае падарожжа не як звыклае шпацыраваньне, а як фармуючае наўмянальнае ўтварэньне, якое зьяўляецца карэнным і абавязвае да падпарадкаваньня. Звычайна ян одаецца на позьніх этапах разьвіцьця. Ты ж перажываеш цяпер. Выдатна і адказна. Разумееш?

— Не зусім, — мяне ўразіла і ўстурбавала такое глыбокае вызначэньне майго жыцьця. — Зноў нешта адбылося і нечакана. Мне паведамляюць, а я не адчуваю. Чаму? Хто я? Мне ад сёньня існаваць строга па правілах: прама, направа, налева — і не выбіраць? А хто будзе мной камандаваць, аддаваць загады?

— Як бытта дагэтуль ты жыло інакш?! — словы Маро ўскаламесілі сьведам'е кожнага і змусілі да ўдумленьня. — Па-першае, прыйшло не

зьнянацку: раней мы казалі, што ты адметнае. Па-другое, не адчуваеш, таму што зьмены надыходзяць не кардынальна, а паступова, ашчадна. Галоўнае: тваё жыцьцё спакваля накрываецца тваімі думкамі. Дасюль табой супольна кіраваў хто заўгодна і як прыйдзецца: зоркі, нябёсы, земеньне, падзем'е, сьветлае, цёмнае, шэрае, фізычнае, эмацыйнае, разумовае і гэтак далей — і сутнасна ты нікому не было патрэбнае. Цяпер ты годнае, вартае і пачынаеш распараджацца сабой самастойна, самасьведама, вяршэнстваваць над усім, што ты ёсьць, але толькі ў межах уласнага манаднага існаваньня. Гэта, безумоўна, не адмяняе непахісных кармічных законаў і Баго. Вось такое палажэньне, казуістычнае — для недасьведчаных, выразнае — для пасьвячоных. Звыкайся і прыглядайся.

— То-бок пацьвердзілі меркаваньне, што мы зь Юсо — ніхто: пры нас можна і сакрэты выдаваць, — лёгкае нездавальненьне адляцела ад Калё мутным воблакам і паказала, як ім далёка да нашага ўспрыманьня сьвецьця.

— А вось і не! — моцна загучала радаснае пярэчаньне Анто. — Наадварот! Да гэтага сусьветнага прадстаўленьня датычныя ўсе! — і ягоныя рукі разьбегліся ўшыркі. — Але наперад таго, як вы спазнаеце гэта і зьісьціцца наканаванае, Кано чакае яшчэ адно, вельмі важнае для нас, выпрабаваньне.

Набеглыя думкі запынілі Анто і па-асабліваму запалілі ягоныя вочы, якія нястрымна паімчалі наперад, за шыбы, удалячынь, да зораў. Усіх таксама захапілі гарачыя памкненьні — і касмасовае энэргетычнае мора загайдалася ад новых пераўтваральных хваляў.

— Кано павіннае самастойна зараз адляцець, а потым наведаць зноў вось гэтае вымярэньне, — адухоўленьне не пакідала Анто і выклікала адпаведныя хваляваньні прысутных. — Гэта магчыма. Нам жа трэба бытаваць тут, каб сьцерагчы і захоўваць каналы двухбаковага лучэньня. Ня зробім — яно аніколі ня здолее вярнуцца назад.

# 26

Калі праўдзіва, дык і пакідаючы сабраньне, я не ўяўляла значэньня таго, што станавілася. Нягледзячы на даходлівыя тлумачэньні, засталося шмат незразумелага. Будучае праясьніць. Я верыла, жадала і ляцела да свайго пакліканьня. Апошнім ураженьнем былі поўныя надзеяў позіркі Калё і Юсо.

Знаходзіцца і чуцца адным у бязьмежжы, няхай і сваім, ніякавата. Я прывыкла да жывога і блізкага атачэньня, да знаёмага асяродзьдзя, а тут выяўляліся спазоры больш абстрактныя, незразумелыя і, як мне здавалася, бязладныя,

створаныя невядома кім і дзеля чаго. Амаль усё было нейкае невыразнае, сутоньлівае, хоць і траплялісія яркія, нават збыт, кампазыцыі — потым я скеміла, што гэта залежала ад майго веданьня й уяўленьня.

Вакольнае бязьмер'е нагадала пра каналы двухбаковага лучэньня, правільнае скарыстаньне якіх, па словах Анто, — ратаваньне для ўсіх. Гэтае цікавае касмасовае становішча заўсёды палашыла людзей, бо доўга ўспрымалася не наўмянальна, а фантазійна, адпаведна разьвіцьця сьведам'я, і не было дасяжным. Нядаўняе адкрыцьцё выявіла сапраўдныя складнікі сусьветных зносінаў сьвядомых стварэньняў і дазволіла ўсім стасавацца без скарыстаньня тэхнічных сродкаў, незалежна ад прастаровага і часовага месца знаходжаньня. Мары аб далёкіх касмасовых вандроўках, аб машынах часо сталі яўнымі. Пры гэтым усе ранейшыя ідэі, пераважна фантастычныя, казачныя і нічым сур'ёзным не абгрунтаваныя, і спробы іх ажыцьцявіць адразу зрабіліся неверагодным глупствам і пустабрэхніцтвам, а іх аўтары абсьмяяныя.

Было даказана, што беспраблемнае наведваньне па каналах (нітках, струнах) зададзеных прастаро і часо магчыма толькі для ноўменаў, то-бок багастворaных манадаў. Фэнамэнальныя альбо выяўленыя, эмацыйна і фізычна ўвасобленыя, уцелаішчаныя істоты — карэкі, арыі

і ўсе іншыя сьвядомыя індывіды Тварэньня — маглі пераносіцца ў іншыя месцы, калі існавала разумовае лучэньне абодвух бакоў. Вольныя скокі да абстрактных, выдуманых, пажаданых ці абыякіх пунктаў, кропкаў, меткаў былі немэтазгоднымі, бо несьлі пагрозы невяртаньня назад альбо наогул зьнікненьня. Апошняе ўспрымалася ўзбуджана, горача, зь няверствам: вельмі ўжо многім бажалася бязладна, нядбайна і безадказна пабадзяцца па Сусьвецьці!

Я ніколі не карысталася двухбаковым лучэньнем, бо ня трэба было, і не мысьлявала пра яго. А тут, аточанае бязьмежжам, задумалася.

Кожнае імгненьне непаўторнае. Таго ж самага цячэньня не здабудзеш. Нават калі падбяжыш, уперад ці назад. Усё аб'ектыўна зьмяняецца, таму што выяўляецца і рухаецца. І цалкам, і складнікамі. Па-за ім — таксама. Галоўнае — зьменлівае ты само. І калі ўдзельнічаеш, і калі назіраеш, тобок калі ты ёсьць! А калі цябе няма?.. Ёсьць другое! Прыродзьдзе беражліва эканоміць і ніколі не пазнаўляецца! Аднойчы зробленае да ранейшага не вяртаецца, застыгае на Вечных Малюнках, Карцінах, Фатаздымках, Кіна- і Відэастужках — ступіць, уварвацца туды немагчыма! Значэньне Вялікага Статычнага неабходна зразумець. Паўтарыць нічога нельга!!!

Менавіта з прычыны гэтага аніяк немажліва рэалізаваць намеры аб мінулым і будучым

накшталт наіўных летуценьняў Вялікага Пятага Ўвасабленьня, Вердзьдзя, тым больш што веды пра сапраўднае гістарычнае альбо няпоўныя, альбо скажоныя. Усякае існае ў Сусьвецьці, буйное й дробнае, пастаянна пераменьваецца. Нават узнавіць, скапіяваць тварэньне адно да аднаго нельга: і рабеньне, і выканаўцаў кранаюць зьмены! Зысьціць можна толькі па падабенстве,але няйначай, як духоўна і разумова! Калі думкам ёсьць ад чаго і да чаго ляцець ды якім чынам, тады й можна рухацца туды-сюды — гэта значыць, эксплюатаваць каналы двухбаковага лучэньня.

Мільгалі розныя краявіды, далёкія і блізкія, статычныя і рухомыя, спакойныя і драматычныя, але нішто не таўхала і ня клікала, як раней, таму я ўспрымала іх адвалочна, працягвала мысьляваць, балазе што ўмовы былі падыходныя.

Думы Баго найвялікія, неспасьціжныя. Прыстасаваныя да ўсяго і ўсіх на незьлічоных этапах вечнага разьвіцьця. Сёньня нам дазволена карыстацца двухбаковым лучэньнем так, як мы да таго дарасьлі. Прыйдзе часо, адчыніцца новае веданьне — і нашыя стасункі будуць іншымі, вышэйшымі й дасканалейшымі. Я мяркую, што пераўтварацца, зьмяняцца і рухацца мы зможам прасьцей, без абмоўкаў, а калі зразумеем значэньне наўмянальнага існаваньня, манадных мажлівасьцяў, тады касмасовыя вышыні й далячыні стануць не астранамічнымі, як цяпер,

а мэнтальна-духоўнымі паняткамі і мы па-сапраўднаму зьведаем прасторы Сусьвецьця, узьнімемся на Баговыя прыступкі.

Уроеньне і ўдумленьне маглі б несьці мяне па міжзор'і й далей, калі б я не адчула знаёмага торганьня. Нутро адразу напружылася, сканцэнтравалася. Увачавідкі выявілася месца Вялікага Шостага Ўвасабленьня. Гэта я зразумела дзякуючы чыстаму і глыбока празрыстаму паветру, якога раней у падарожжах не страчала, таму што навакольнае асяродзьдзе карэкаў было надзвычай забруджанае ад іх матэрыяльнага быцьця і цяжкіх, змрочных намыслаў.

Нягледзячы на ўрбаністычнае ўбраньне, наўкольле патанала ў квітнеючых садах, поўнілася птушынымі галасамі. Як потым высьветлілася, яго аблюбавалі мутакі высокага інтэлектуальнага прызначэньня. Яны матэматычна вызначылі парамэтры Абсалютнага Існаваньня, кармічныя велічыні, альгарытмы вераваньня і распачалі адпаведна задумаў апрабоўваць спосабы стварэньня і праіснаваньня энэргетычных носьбітаў, ці бо жыхароў. Да пажаданага высокаарганізаванага грамадзтва заставалася ўсяго нічога. Але не зазвычаілася: ніхто і не меркаваў, што адкрыцьцё можна рэалізаваць толькі ў духоўным, высока сьведамым асяродзьдзі, а да гэтага было вельмі далёка. Як і заўсёды, вырашана было абысьці ўмовы, падмануць-вызьвярнуць сэнсы —

і такім чынам дасягнуць памыснага. Калі раней хітрыкі й выкруты спрацоўвалі — сьмелачы ніколі не задумваліся, чаго гэта каштавала чалавецтву! — дык цяпер манэўры не дапамагалі, а, наадварот, спараджалі новыя цяжкасьці, аддаляючы ад мэтаў: расплата надыходзіла імгненна і шматкроць. Усе рэальна пераканаліся, што промыслы Баго нікому не падуладныя і аніманы ніколі не дасягнуць Ягоных Вышыняў!

Але ўсё адно разуменьні заставаліся рознымі і жыцьцё па-ранейшаму кіпела.

# 27

Я ляцела над хатамі, дрэвамі, вулкамі, прыслухоўвалася да ўнутраных ваганьняў, вызгукаў.

І раптам ад іх нейкага неспасьціжнага спалучэньня я непрымусна прызямлілася і стала рухацца пешшу. Вабілі сьветлыя вокны адмысловага збудаваньня. Ніякага валваваньня яны не выклікалі. Я завітала да вечаровых улягаў, таму сьмела, чамусьці па-чалавецку, пастукалася. Праз колькі шумных імгненьняў дзьверы расчыніліся.

— Я думала, людзі, — пасьля зьдзіўленьня сьлічнае мутака ўсьміхнулася і ўжо бяз словаў, цёпла запрасіла ўнутр.

За лагоднымі позіркамі глыбокіх вачэй, мяккімі рухамі я зноўку ўбачыла Юлё і ніякавата сьцепанулася.

— Як на дварэ? — пытаньне прагучала, нібыта я туташняе і адлучалася.

— Ядрана, ціха.

— Пэўна, нашых разумнікаў ізноў зарымсьціла.

— Як гэта?

— Мяне зваць Юнто, а цябе?

— Кано.

— Дык вось, Кано, мы тут усе — мэнтальцы, быццам бы прыгавораныя да вышэйшага: трэба хутчэй туды, — і Юнто падняло вочы ўгору. — Але не атрымліваецца: мабыць, рыла недастаткова адмылі. Вось і намагаемся! Сама ўвішныя прагнуць так аблічбаваць навакольле, каб зь Неба яно выглядала чыстым, сьвежым, духоўным і для зечаньня прывабным. Яны мяркуюць, што за мудрагелістым кадаваньнем будуць нябачныя глумныя мазгі і чэрствыя сэрцы. На ашуканцтве далёка не заедзеш. Яно заўжды вяртае назад, да нічога. Разуменьне будзе, але шкада, што тых, хто да яго дойдзе, застанецца зусім мала.

— …А ты што тут робіш? — спытала я, каб хоць нешта праясьніць.

— Нічога, — адказала яно, выглядаючы выракчона і страчана.

Мяне гэта кранула, і ад грудзей да галаўных вуземкаў пабегла нязвыклае хваляваньне. Шчупальцы захісталіся і пачырванелі. Хвосьце насторшылася. Я глыбока ўздыхнула, паслаўшы яшчэ адно мысьлявое пытаньне:

— Што адбываецца?

— Ня ведаю, — Юнто павярнулася да вялізных вокнаў. — Нават яны не прапускаюць маё турзаньне. Ты было там. Знадворку ж нічога не чуваць?

— Не.

— А пасяленьне кішыць ад праблемаў, агульных і прыватных!

— ???

— Так. Нашыя сьцены хаваюць такія трагедыі, якія Пятае Ўвасабленьне не магло і ўваабразіць! Калі б яны разбурыліся і ўсё рынула вонкі — чарговае сканчэньне сьвецьця было б непазьбежным.

— Ты не перабольшваеш?

— Ніколькі. У гэтых галовах няма Баго. Навошта такім існаваць?

— Дык што, з дамоў ніхто не высоўваецца? — я зірнула на Юнто з падазрэньнем, зусім ня ўдумваючыся ў яго апошнія словы.

— Ты мне ня верыш… А я і веру табе, і бачу цябе, — яно пачало ўглядацца ў цемрыва за вокнамі. — Нас зьбіралі сюды доўга. Усялякіх. Галоўнае, каб былі унікумы і нутром не падобныя ні да каго. Я — вешчае, магу прарочыць і весьціць. Пасялілі паасобку бязвыйсьцева, забясьпечылі, прыстрашылі. Заданьне было для ўсіх адно: як мага паўней і зьмястоўней выражаць сябе, выкладваючыся максымальна.

Дзеля чаго — не паведамілі. Адно што націснулі на сьведамае: ад вас залежыць касмасовае будучае.

Я слухала і дзіву давалася: нічога такога ня знала, хоць і мутака. А калі падумаць: жыву як набяжыць, мала цікаўлюся, не ўнікаю…

— Пра нас вядома нямногім: надзвычай сакрэтнае дасьледаваньне. Лічу, што яно не для ўсіх і скарыстоўваюць яго таксама адзінкі. Інакш было б вальней.

Яно сьцішылася, сумна пазіраючы на вокны.

# 28

Мяне ўстарнавала. І незвычайна. Гэта адбывалася ня дзесьці, у лябірынтах лёсаў, на пракаветных гонях, а тут, пад жывое дыханьне і на сьвежыя думкі. Ведаць — значыць удзельнічаць. Я — у таёмым асяродзьдзі. Сярод такіх, як Юнто. Адцяпер іхныя ўмовы — мае.

Як я трапіла сюды? Навошта?

— Цябе заманілі, як арыгінальнага. Наяўнае абнаўленьне.

— Хто?

— Яны.

— Як?

— Умеюць лавіць. На тое мы тут і сядзім.

— …То-бок…

— Менавіта. На маё жыцьцё.

— І ты…

— Згадзілася, як і кожнае замураванае. Хоць штосьці разнастайнае.

— А я?

— Колькі прапала з-за твайго сабетніцтва?

Майму ўзрушэньню не было канца.

Здавалася, я не існую: зьніклі рухі, эмоцыі, думкі. Усё трапіла ў небыцьцё. Пустое бязьмежжа паралюшавала — не зачапіцца. Дзе выйсьце?

— Зьмяні меркаваньне — і становішча абновіцца, — абыякава параіла Юнто.

— Шмат у цябе такіх, як я? — пагардліва так і цякло ад мяне.

— Не. Ты першае.

— Значыць, ад сумленьня штосьці засталося. А чаму я?

— Я не капала карэньня з-пад белага каменьня. Мне было ўсё адно.

— Але ж лёсіла мне. А выбіраць выпадала?

— Толькі ў значэньні адпавяданьня.

Я пачало ўяўляць варыянты ловаў і майго закабаленьня. Усё загадзя падрыхтоўвалася, рабілася наўмысна, мэтанакіравана, а я тым часо бестурботна й безжурліва гойсала, штосьці вычварала. Чаго такога адметнага вылучыла?

— Ты зачапілася ўспрыманьнем адбывалага. Яно ў цябе асаблівае, удумлівае.

— А што, іншыя глядзяць на сьвецьце бязмысна?

— Усе мазгуюць, але скідваюць на эмоцыі, а ты — пераважна на одумы.

Глупства! Уражлівей і чульлівей за мяне нікога нямашака. Нездарма за мной так цікуюць апекуны. Тут штосьці ня так!

— Акрамя таго, усё факусуецца на мне, а я пазначанае — і здаўна.

Ага! Менавіта з-за гэтага вышмаргнулі: проста трапілася, дурное.

— Ня проста, — гучна вымавіла Юнто і ўсхапілася.

Штосьці ўгледзіўшы, адышло ўбок, нагнулася, акінула вачыма памяшканьне і скоса зірнула. Яго паводзіны і позіркі на імгненьне намалявалі Юлё і ўтварылі колькі голскіх этэрных акордаў. Я ўздрыгнула.

— Цікава? Асацыяцыі ўзьнікаюць часта, але мы, заклапочаныя і сутарныя, не заўважаем гэтых натуральных зьяваў.

Яно не дагаворвае, абыходзіць, намінае, падштурхоўвае. І ўнутранага выражэньня няма! Во якое здольнае вядзьмо!

— Непаразуменьне — арганічнае карно лёсаў, — загадкава мовіла Юнто, іранічна пагледзеўшы на мяне. — Яно і злучае, і падзяляе, і стрымлівае — як каго. Гэта — добрае памагатае часо і прызначанае для спакойнага і мірнага вырашэньня праблемаў, калі наяве рознае ўсьведамленьне. Дайшло?

Канечне! Прылічыла да дурняў і чагосьці чакае! Жахліва! Ну і ўліпла! Што ж рабіць? Як адсюль змыцца?

— Цябе ніхто адсюль ня выпусьціць. Усім іством ты іхняе. Калі ты гэтага пакуль ня цяміш і не жадаеш сабе нашкодзіць, раю паверыць і адпачыць. Раньне мудрэйшае.

Сапраўды, я стамілася і ніякавела ад палючых думкаў. А забыцьцё гоіць. Вунь і ложа. Бадай, лягу.

У запамках мітурылася абы што. Адкуль тольі яно й бралася. Само такога ніколі ня ўроіш. Насланьнё нейкае, хоць Адверху пастаянна нагадваюць, што ўсё спараджае ўласнае сьведам'е. Як бы там ні было, а Неба прычыняецца да любых нашых абставінаў і ўлічвае выключна свае мэты, разглядаючы нас як звычайнае матэрыяльнае зьмесьціва сваіх ідэяў альбо біяробатаў, а дакладней — як уяўнае, ілюзорнае стварэньне Касмасовага Прызваленьня. Можа, як звычайна, плялося б і яшчэ якое мысьляваньне, толькі я хутка забылася.

# 29

Хоць начных крозаў і стацьця было шмат, але жахаў, соннага душаньня яны ня выклікалі. Ранкам я прачнулася лёгка, са сьветлым адчуваньнем і нічога ня памятала.

За ўчарашняе стала няёмка перад Юнто, якое знаходзілася побач і чуняла. Пацягнула да выбачэньня, але штосьці стрымала.

Тады я наблізілася да вакна.

Назьне было сонечна, ясна. І — рухаліся мутакі, нават карэкі?! Мяне торгнула.

— Ты таксама можаш выйсьці, але на большае не разьлічвай: псыхічнае поле не дазволіць. Папярэджваю: нават і не спрабуй.

Прагнучы хоць бы якіх зьменаў, я шмыгнула вонкі.

Тут цякло звычайнае нясьпешнае жыцьцё, і на мяне ніхто не зважаў. Гэта задаволіла, і я пакрочыла наўгад.

Разнастайнае велягурнае акружэньне магло б захапіць, калі б не адчэпнае жаданьне зьнікнуць. Усё здавалася патэнцыйным стоўпішчам магчымасьцяў, якія дапамаглі б ажыцьцявіць гэта і цэлым вярнуцца ў касмасо, як раней. Я ўглядалася, чакала, вярцела і целам, і помысламі, але нічога не адбывалася — і мяне злавала. Дзе яно, выйсьце? Гэта ж маё сусьвецьце! Чаму ў ім нельга воліць, гаспадарыць, камандаваць? Зноў ашукваюць, сьмяюцца, паказваюць дулі! Хто вы? Пакажыцеся!

І раптам мяне страсянула так, што я ўпала на далоўе і пачало курчыцца ад нуднага ўнутранага вярчэньня ўсяго шлуньня. Адольвалі болевыя адчуваньні. Думкі, сьвядомыя рэакцыі

прапалі. Дзесьці гучалі мэлёдыі, мроіліся неспасьціжныя зрушэньні й пэртурбацыі сутнаснага. Неверагодна, але маё іство ведала, што за ўсім гэтым абавязкова стаіць тое, што завецца выратаваньнем.

І яно выявілася! Схіляючыся і ахутваючы, забрала мяне ад месца здарэньня і панесла туды, дзе сапраўды чакала збавеньне. Імгненьнямі агоўтваючыся, я адчувала ягонае занепакоенае дыханьне, узбуджанае тахканьне сэрца і шчырыя, ласкавыя позіркі. У промнях вачэй, мысьлявых вылучэньнях я знаходзіла то Юлё, то Юсо, то Юнто.

Прачхнулася ў памяшканьні, на тым самым ложы. Прастаро пуставала, а потым напоўнілася гукамі й флюідамі. Да мяне наблізілася Юнто, а дакладней — ягонае ўсьмешлівае аблічча.

— Выдатна! Апрытомнела! — узрадавана казала яно, завіхаючыся ўгалавах. — Ох, і шмат у цябе людзкога! А я думала, што арыё жывуць побач толькі фізычна. Колькі ж яны навытваралі, што Нябёсы прыладзілі іхныя звычкі і да нас. Атрымліваецца, і сусьветныя катаклізмы ня ўсё вырашаюць. Трэба памазгаваць.

Мне было добра, і я ня думала.

Але неўзабаве сьведам'е ажывілася і нагадала аб маім драматычным становішчы. Цікава, што яно падалося мне не такім безнадзейным, як учора. Я стала прыглядацца да Юнто.

— Цябе не пакідаюць асацыяцыі майго падабенства да кагосьці, — распачало яно, разраджаючы напружаньне. — Не хвалюйся. Усё нармальна. Яны ўзьнікаюць, таму што ты чуйна, адэкватна ўспрымаеш вонкавыя подступы, набліжэньні да сябе. Покуль яны незразумелыя. Калі жадаеш, магу тое-сёе растлумачыць.

Безумоўна, я пагадзілася і адзначыла ажыўленьне, нават зблiжэньне між намі — і мяне гэта ўзрадавала.

# 30

Юнто зь цікавасьцю зірнула і таксама вясялей прамовіла:

— Адкрыцьцяў будзе многа. Ты падарожнічаеш, я — таксама. Ты — фізычна, я — духоўна. Цябе вядзе натхненьне, мяне — асэнсаваньне. Ты як сьляпое, я як відушчае. Ты знаеш, я ведаю.

Мяне адразу зьдзівілі й захапілі яго ляканічныя вызначэньні й характарыстыкі. Уражвала падрабязнае веданьне майго жыцьця. Сапраўднае варажбіцтва!

— Канечне, адказаў на ўсе пытаньні ў мяне няма, але асноўнае распавяду. Мае продкі — валшвы. Ад іх ідуць і здольнасьці. Гэтыя гістарычныя зьвесткі былі вычарпальнымі датуль, пакуль я ня трапіла сюды. Тут праясьнілася многае. Кіравецтва паселішча, адыёзнае ўвогуле,

любіць паўтараць: Deus conservat omnia — і, наўзьдзіў, беражэ кожнага як каштоўнае энэргетычнае рэчыва, заахвочвае асьветніцкія памкненьні і не забараняе карыстацца касмасовымі інфармацыйнымі каналамі, даступнымі толькі ў гэтым месцы. Я ўзялося за гэта і вызначыла сваё паходжаньне аж ад нараджэньня Сусьвецьця!

Маё зацікаўленьне расло, вочы гарэлі, і над мяне зьбіралася яркае пярэстае воблака. Гэта і Юнто дадавала ўзбуджэньня: яно таксама распалялася, ператвараючыся ў сьлічнае прамяністае стварэньне.

— Гэта было неверагодна! Даведацца пра такое! Спасьцігнуць сапраўднае, праўдзівае! Я было на мяжы памяшаньня! Насамрэч, ля вытокаў быцьця стаялі прамыя божыя ўвасабленьні, то-бок пярвічныя духоўныя манады. Яны вечныя, наўмянальныя. Выяўляюцца, увасабляюцца, уцелаішчваюцца ў любым мэнтальным, астральным, матэрыяльным асяродзьдзі, набываюць розныя формы і аблічча, існуюць безьліч разоў, дадаючы да сябе ноўніцтвы й досьведы, узбагачаючыся, узьвялічваючыся, але застаючыся сутнасна нязьменнымі, каранішчамі й галамнямі назаўсёды злучанымі з Баго.

— Дрэва! — радасна выгукнула я. — Уявеньне ўсіх часоў і народаў! Выдатна! Усё ўвачавідкі,

і хадзіць далёка, капаць глыбока ня трэба! Назірай, думай — і адчыняцца Баговыя вярэі!

— Так, агульнае — заўсёды больш зразумелае і дасяжнае, — працягвала Юнто, зіркаючы на вокны. — Але як знайсьці на дзерве сваё вецьце і свае лісточкі? Атрымалася і складана, і проста. Складана было наўчыцца, а проста — убачыць. Я доўга і напружана шукала шляхоў — і знайшло. Дапамаглі кнігі. Усё пры нас, — і яно пальцамі паказала на нашыя галовы. — Дастаткова настроіцца — і тваё касмасовае гольле выявіцца, зашуміць толькі для цябе. А каб тое адбылося, неабходна шмат рыхтавацца. Я працавала. Спатрэбілася некалькі гадоў! І гэта з маімі спадкавымі талентамі! А як іншыя? Садзейнічала адасабленьне. Калі я празерыла… Ніякімі выказваньнямі нельга перадаць таго, што прыходзіць і паказваецца. Адно скажу: якое б ні было выяўленае жыцьцё — яно маленькае сьцябло на маім велічным і магутным дрэве, якое заўжды расьце на Славу Баговую.

# 31

Хоць я і знала пра ўсё гэтае, але падзяляла почавы і ўражаньні Юнто, шчыра захаплялася ягонымі намаганьнямі. У складаных умовах яно здолела дайсьці да высокага практычнага ажыцьцяўленьня таго, аб чым многія толькі

марылі. Валоданьне такімі ключамі памнажала ўласныя мажлівасьці. Вось толькі рэальна ўжыць іх не было дзе.

— Ты памыляесься і сьпяшаесься, — экстрасэнсорна бачачы мае настроі, працягвала Юнто. — Пачынаньне падштурхнула, дало новае асэнсаваньне свайго жыцьця. Ад мяне патрабавалі выражэньня — і я выявіла яго... Крыху пачакай.

Яно ўзьнялося, пачало хадзіць і як бы ўслухвацца. На нейкае імгненьне спынілася, заплюшчыла вочы і напружылася. Ад ягонага цела ўва ўсе бакі палілося блакітнае зьзяньне, якое працінала навакольныя рэчы, маё нутро і нібыта прачышчала, выслабаняла ад непатрэбнага, нанесенага. Засталося адчуваньне свабоднага і неабходнага напаўненьня.

— Вось так будзе лепей, пакуль перашкаджаць нішто не павінна, — уздыхнула Юнто і села наўспроць. — Ты хвалюесься — і гэта натуральна.

Я сапраўды ўнутрана пытала: а якое дачыненьне да мяне мае такое майстэрства закаванага вязьніцтва?

— Непасрэднае, — спакойна адказала маё візаві. — Табе трэба сысьці адсюль?

— Так.

— Мне таксама. Да таго, як ты зьявілася тут, гэта было неажыцьцяўляльна.

Я зьдзіўлена ўтаропілася.

— Нашыя лёсы злучаныя.

Гэта пэўна, пасьміхвалася я: так прыліплі адно да аднаго, што я ўжо і начую тут! Разам з тым, што нас можа аб'ядноўваць?

— Калі гэтае вечнае кола, — і Юнто распасьцерла рукі, — зводзіць і неаднойчы, значыцца, трэба шукаць значэньня.

А чаго насіцца? Яно навідавоку: ратаваньня безь мяне няма — вось і ўсё!

— Безь мяне таксама, — ягоныя вочы іранічна паблісквалі.

Я пазірала і скрушна згаджалася. Кляпцы зашчоўкнуліся. Выйсьця няма. Патрапіла па самае годзе. Гэтае мутака мяне не адпусьціць. Трэба слухацца. Вынікае, што ўсе атрыманыя ім касмасовыя веды пайшлі толькі на тое, каб заарканіць мяне. Ну і вушлае гадаўё! Калі шчыра, дык і я зрабіла б гэтак жа. Як тое адбылося? Льга пацікавіцца. Спатрэбіцца!

Юнто маўчала і глядзела ў вакно.

Чаму я ня ўлоўліваю ягоных думкаў, нэрвовых хістаньняў? Ня можа быць, каб іх не існавала! Дакладна, абараняецца. Іх тут да ўсякага вучаць.

— Атожылкі растуць паасобку, пераплятаюцца, калыхаюцца не ад таго, што самі пажадалі, а таму, што ім так дадзена. Па-свойму сьведамыя, яны, нат на моцнае бажаньне, ніяк

ня зьвернуцца да найбліжэйшага, калі таго ня вырашыць дрэва. Непасрэдна гольлі злучаныя і абменьваюцца толькі зь ім, хоць добра бачаць і ведаюць адно аднаго.

— Да чаго гэта, Юнто?

— Да таго, што мы прызвычаіліся да аднаго ўспрыманьня і не ўяўляем інакшага. Абсалютызуем свае выразы, фізычныя, эмацыйныя, разумовыя, зусім не задумваючыся, што на сьвецьці ёсьць шматлікія.

— Але ж мы стасуемся з усімі, узьдзейнічаем на іншых.

— Таму што так вырашыла наскае дрэва.

Мне б задумацца, але было чамусьці няёмка, і я адчувала сябе вінаватым.

# 32

— Я цябе пакрыўдзіла? — болкі шкадаваньня паляцелі ад мяне.

— У рэчышчы нашага ўспрыемства — так.

— То-бок і майго, і твайго?

— Але.

— А іншага?

— Гледзячы якога, — як мне падалося, трохі прывярэдліва мовіла Юнто.

— Ну, калі яго многа, а я ня ведаю ніякага, акрамя свайго, тады можна ўжыць ключнае, — гульліва і знаходліва выдала я.

— Гэта якое? — крыху спаталыжылася Юнто.

— Прабачэньне, — радасна гукнула я і паслала пяшчотныя імпульсы. — Гэтае адмыкае намыслы любых стварэньняў.

Тут Юнто разгубілася канчаткова і пачало нястрымна вылучаць пярэстыя аблокі, якія хутка запоўнілі памяшканьне. Усталёўвалася зычлівае, дабрадушнае і памыснае асяродзьдзе.

— Прашу даравання за легкадумныя і эгаістычныя паводзіны, — лапатала я, сапраўды прагнучы паляпшэньня адносінаў.

— Ціха, — прашаптала Юнто і насьцярожылася, утаропіўшыся ў вокны. — Церазь іх прасочваецца назіраньне.

Я нічога не адчувала, але паверыла: умовы яго.

Яно пачало хадзіць, махаць рукамі, хвосьцем, энэргічна варушыць шчупальцамі, нешта казаць. Складвалася ўражаньне, што з кімсьці размаўляе альбо стасуецца.

Узбуджана балбочучы, нечакана скокнула да мяне, прыгарнулася і зладзіла нязграбнае абдыманьне. Я цопнулася назад, але Юнто не адпускала, сьціскала абдоймы і жэстыкулявала, намянаючы, каб было ўзаемна.

Не ўдаючыся ў роздумы, я інтуітыўна падтрымала раптоўнае парываньне і таксама абхапіла яго рукамі. Праз колькі імгненьняў наўмыснае мілаваньне скончылася, Юнто спынілася,

адсунулася ад мяне і глыбока ўздыхнула, кінуўшы два-тры зіркі на вакно. Дзіўна, але ніякага нездавольля гэтае здарэньне ў мяне ня выклікала.

— Выбачай за мае похапы, — усьмешліва прамовіла Юнто, хмыкнула. — Практычна пераканаліся, што розныя ўспрыманьні могуць злучацца яшчэ і тады, калі ёсьць разуменьне. Так? — і яно загадкава паглядзела на мяне.

— Напэўна, — асьцярожна адказала я, узьняўшы вочы. — Але, шчыра прызнацца, стацьцё не зусім дайшло. Што адбываецца?

— За намі цікуюць, — паважнае задуменьне нанава адолела Юнто, — а мы абараняемся. Няхай бачаць, што мы нат фізычна цягнемся адно да аднаго. Думкі я заскрыла. Але эмоцыі прабіваюцца: яны дужа шчыльныя з учынкамі. Так што — раю вонкава выяўляць прыязнае стаўленьне да мяне. Гэта нялёгка, але покуль трэба. Мы павінныя паказаць: іхняе экспэрымэнтаваньне з намі ўдалае. Нездарма ж яны зьбіралі нас! А мы тым часо…

— Што? — я не ўпадабала і ўзлавала, як раней. — Як гэта: зьбіралі? Я дзейнічаю самастойна, а не па ўказаньні, азначэньні!

— Радавацца неабходна, — і яно расквітнела, усьміхаючыся і гледзячы па баках, але атрымалася яксьці штучна, вымучана. — Не нэрвуйся. Тваё галяктычнае поле — і іхняе таксама: некато-

рыя асобы ў ім — інкарнацыйнае я… Але пачакай, пра дэталі — апасьля…

— Дык вось адкуль усе мае асацыяцыі! — я ўнурылася, але, апамятаўшыся, хуценька зрабіла пакрыўджанае аблічча: маўляў, каханкі сварацца.

Юнто ацаніла перакшталчэньне, наблізілася і пяшчотна кранула мяне сваімі канечнасьцямі, нібы просячы прабачэньня. Я прыхілілася да яго. Прымірэньне адбылося, і дамаўленьне дасягнутае! Нязвыклае гуляцца, я ўзапраўды ўскунежылася.

— Цябе прымусілі? — я бажала знацьця і ўпарта вярталася назад, пазьбягаючы этэрнага маўленьня, узаемнічаючы бязгучна, думкамі, як і Юнто.

— А ты як лічыш? — адляцела ад яго двухсэнсоўнае.

— Чаму я? — згушчаліся мае ўпорчывыя пасылы.

— Ты мне спадабалася, — як апарыла яно.

Валваваньне пайшло па нутры і спынілася недзе ўверсе. Сьведам'е паглынала ўсе адчуваньні і заўзята працягвала: адчаго? Зноў зьнешняе і непадуладнае ўзьдзеяньне?

— Незразумела. Ясна адно: такое даецца не тутэйшымі лябараторыямі, — і Юнто паказала на вокны, — а вышэйшымі, Нябёсамі.

— А як гэта было?

— Прапаноўвалася некалькі варыянтаў, і я прыглядалася.

Так і ў мяне заўжды: мноства, ілюзійныя выбары, а празначана адно. Ці варта мазгаваць і гадаць?

— Абавязкова і кожнаму! Думаньне як мага ярчэй і гарачэй распальвае касмасовае вогнішча і паказвае магчымасьці Тварэньня. А як яно ажыцьцяўляецца: фізычна, астральна, мэнтальна — гэта ўжо творчыя ды разнастайныя намаганьні Аўтараў. На гэтым і стаіць жыцьцё.

— Чаго ад нас чакаюць?

— Ці здольныя мутакі на духоўнае лучэньне накшталт каханьня Пятага Ўвасабленьня? Калі так, тады можна прарвацца да Баговых Вышыняў.

Я сьцішылася. Неакрэсьленыя і блытаныя сподумы закруціліся, узрушылі паветра і кранулі майго "каханага". Адпаведныя флюіды сабраліся і над яго.

— Няўжо Нябёсы для Шостага Ўвасабленьня ня вызначылі такога абавязковага энэргетычнага заданьня, як каханьне для Пятага, і даручылі аніманам самім прабівацца? — неўразумявала я.

— Мяркую, што паглыбляцца ня варта, — цьвёрда прапанавала Юнто, — ня тое трэба зараз рабіць. Бярэмася за сваё.

# 33

І прыйшло галоўнае.

Выслухаўшы ашаламляльнае апавяданьне Юнто, я зьдзівілася, трохі павагалася, але даверылася і ўнутрана падрыхтавалася.

Яно знаходзілася напярэдадні вялікага праісначаньня — народзінаў, ці бо вылучэньня зь сябе новага фізычнага жыцьця.

Рана ці позна такое адбывалася амаль з кожным мутакам, але не заўсёды аднолькава. Усё залежала ад вынікаў адгалінаваньня-адшчапленьня: у немаўля інкарнавалася альбо новае духоўнае стварэньне, альбо ранейшае, бацькоўскае. Ад першага паходжаньня раджаючае заставалася жыць і здольным да паўторных аддзяленьняў, ад другога — памірала. Чаму такое здаралася, было невядома нават каляністам.

Спэцпаселішча і асаднае жыхарства так паўплывалі на Юнто, што ягоныя фізыялагічныя працэсы зьмяніліся і плоднае высьпяваньне паскорылася. Мабыць, зрабіла сваё і ўзьдзеяньне дасьледчыкаў. Звычайна да нараджэньня мутака рыхтуецца доўга і сутнасна, унутрана набрузае, напукае, росьціць у сабе фізычныя, эмацыйныя, разумовыя зародкі, завязі, утварае месца для новага Боскага выяўленьня. А калі надыходзіць часо, тады яно набывае адпаведныя

вонкавыя формы і прыладкоўваецца да неабходных умоваў.

Ці былі такія цяпер, я ня ведала.

— Усё як мае быць, — задаволена казала Юнто і азіралася па баках, неяк дзіўна і рытмічна пакрэкваючы ды выдзяляючы клапатлівыя флюіды.

Я глядзела і чамусьці ўзгадвала курынае туленьне і кохканьне вакол кубла, калі выводзяцца пісьляты. Міжволі ўсьміхнулася.

— Правільна, усё аднолькава, як уверсе, так і ўнізе, — разважала і месьцілася на ложы Юнто. — Рады радуюць, незалежна ад таго, як яны праходзяць. Гэтае дзейства проста паказуе, што мы павінныя ўспрымаць сваё жыцьцё настраёва, усьмешліва, якім бы пакутлівым яно ні было.

Мяне кранала і ўлагоджвала ягонае стаўленьне да адбывалага: суцяшаліся шчупальцы, хвосьце, вочы, і я адпрэчвала думкі пра магчымае трагічнае станьнё. Мае ўяўленьні праісначваліся, зьяўлялася бачаньне чагосьці іншага, важнага і значнага як для мяне, так і майго натхняльнага спрыяя.

— Ах, мне вельмі ўтульна і добра, як ніколі! Дзякуй табе, Кано, і выбачай! Адцяпер я буду шмат балбатаць і рабіць, нават паскуднае: нам, парадзіхам, можна, адвеку дазвалялася. Спадзяюся, не апошняе разо, — і яно засьмяялася, як ніколі — шчыра і заразьліва.

Я ўслухвалася і вабілася. Праніклівае маўленьне было дарэчнае і забірала. Мярэсьціліся цікавыя стракатыя карціны.

— Апалае лісьце ацяпляе і ўгнойвае земеньне ня толькі для дрэва, але і для ўсяго, што расьце. Веды даюцца аднаму, каб карысталіся ўсе. Усьвядоміш гэта — забуяеш, не — рана засохнеш. Калі мяне пазнаёмілі з касмасовымі жыцьцёвымі плянамі аніманаў, першае, што прыйшло на глузды — як гэтым скарыстацца для сваіх мэтаў. Памятаю вучыцельскія вочы: шкадаваньне і засмучэньне. Са мной тады доўга не размаўлялі, і я пытала сябе: адчаго? Прагдядваючы твае дарогі, я адчула жаданьне дапамагчы і зусім не дзеля таго, што ўбачыла на іх некаторыя свае ўвасабленьні (колькі іх было на іншых!), — і мае вукары ажывіліся, заклапаталі вакол. Але нат і тады да мяне не дайшло: чаму? Сьцяміла, калі ты адправілася вандраваць. Усе твае лёсавызначальныя выбары паўсталі вялікім галінастым дзеравам. Ты зьбіралася лятаць вольна, гуляшча, то-бок множыць сваё пуставецьце і страты. Мяне гэта растрывожыла. І, ведаючы спосабы, я вырашыла павадзіць цябе.

— Ты нічога ня кажаш пра маіх другоў.

— Так, яны — выдатныя прыяцелі і мудрыя настаўнікі. Табе пашанцавала. Як ні дзіўна, такіх я атрымала толькі тут.

— А калі б не было тваіх намаганьняў?

— У лясах шмат заўчасных сухастояў, зламаных, сагбатых, пакрыўджаных расьлінаў, а што адбываецца з гольлем? Ня ўсё роджанае дасягае вечнасьці. Мноства здрабняецца, расьсейваецца, скарыстоўваецца на ўгнаеньне, харчаваньне тых, хто здолеў вытрымаць, прайсьці выпрабаваньне. Шляхі быцьця перапоўненыя падарожнікамі, але ня ўсе з праваднікамі.

— Ага, павучаюць многія. Справамі, пачуцьцямі, парадамі. А як знайсьці правільныя веды?

— Усялякае навучаньне карыснае, але найвышэйшае — мэнтальнае, мысьлявое, духоўнае. Яно — непасрэдна ад Баго.

— Зноў-такі: як распазнаць?

— Слухаць і чуваць. Сябе, іншых, акольле. Заўсёды, кожнае імгненьне жыцьця. Калі мысьленьне працуе, зьяўляюцца падказкі, арыенціры.

— Маё помнае маўчыць, значыць, мне альбо рана, альбо…

— Наіўнае. Узгадай дэталі і ўдумайся…

І раптам Юнто ўздрыгнула і сьцяла вусны, заплюшчыўшы вочы. Колькі разоў лыпнула, уздыхнула і, усьміхнуўшыся, ціха нахілілася набок. Сьведам’е пакінула яго.

# 34

Наўкольле неспадзявана зьмянілася. Пасьвятлела. Паясьнела. Загучала. Бачылася да дробязяў і нутра.

Аднекуль выніклі стварэньні: фізычныя, астральныя, духоўныя — я не разьбірала, як і не разумела іхных паводзінаў. Галоўным чынам, яны завіхаліся вакол Юнто. Некалькі займаліся мной. Памагалі, лагодзілі, дабравесьцілі. Мне рабілася багавейліва, здавольна, дабратліва.

Колькі гэта доўжылася — ня знаю.

А скончылася і расьсеялася ціха, баўна, спавольна. У паветры засталіся чыстыя, прасьвядныя, ласкавыя і шчасьлівыя подзьмухі.

Ад чароўнага запаланеньня абудзіла тонкае і працяглае дзіцячае крычаньне.

Я прахапілася і ўбачыла, што нас ужо трое. За разглядваньнем трэцяга зусім забылася на Юнто, але яно само нагадала:

— Дабрыдзень, Кано! Вось і я! Вяртацца…

І Юнтом нанава авалодала забыцьцё.

Імгненьня хапіла, каб да мяне дайшло адбывалае, а сама галоўнае: усе жывыя, тут і патрабуюць майго дбаньня. Я хвалявалася, шчупальцы тапырыліся ўва ўсе бакі, распырскваючы эманацыі: што рабіць?

І раптам у паветры пачало гаманіць і голсчыць:

“Нічога асаблівага. Сукойся, настройся на мысьляваньне, вылучай усьцешныя, памысныя думкі, атуляй радаснымі і клапатлівымі намерамі. Ім гэтага хопіць надоўга. А потым, каб не пашкодзіць учынкамі ці эмоцыямі, хутка выдаліся. Раім наведаць сваіх прыяцеляў. Яны чакаюць. Праходы адчыненыя. Выходзь падрыхтаваным”.

Дзіўна, але я без распытаў і пярэчаньняў паслухалася і, не азіраючыся, каб не ўзбудзіцца, ірванула вонкі.

# 35

Гэтае лётаньне здалося карацейшым за іншыя і запыніла не знадворку, як раней, а вонутры памяшканьня, якраз перад кутнікамі.

Ад зьдзіўленьня яны ахнулі, а Юсо нават усхліпнула, адвярнуўшыся.

— А мы зачакаліся, — Маро радавалася, абдымала, гаварыла, мітусілася больш за ўсіх, вылучаючы мноства яркіх, цёплых промняў. — Ведаеш, якое інакшае часо ў розных вымярэньнях? Мы з Анто тут так атайбаваліся, што нас прымаюць ужо за сваіх і хутка пажэняць. Ха-ха-ха!

— Кінь шуткаваць і лухцець, — шчырае і ўсьмешлівае процідзеяньне Анто выклікала замілаваньне і не адпіхвала, а, наадварот, прыцягвала.

— Так, мы сапраўды думалі пра цябе, чакалі, верылі і шмат чаго перажылі, — выражэньне Калё было стрыманае, але задаволенае.

— Сядай, разьмяшчайся, будзь як дома, — абмахвала ўслоны скарачамі Юсо.

— Дай жа на цябе падзівіцца! — Маро, зусім як паміж людзьмі, узяло мяне за плечы і пранікліва зазірнула ў вочы. — Як ты цяпер выглядаеш? Ці зьмянілася? Што цікавага?

І пасьля хвіліннага маўчаньня і ціхага агульнага засяроджаньня гучна мовіла, як бы абвесьціла:

— Ёсьць! Радуймася і весялімася!

Небывалае ажыўленьне і страсеньне ахінула ўсё жывое. Акольле ўзрушылася, набрузла невядомымі сокамі. Вокны пачалі выпускаць сьвятла больш, чымся прымаць. Калё і Юсо моцна абняліся і трымаліся так, пакуль ад Анто не адляцела ласкавае і амаль бацькоўскае:

— Распавядзі!

Маё апавяданьне было хвалюючым, крыху бязладным, затое слуханьне — прагным, сама лепшым на сьвецьці: я ня памятала такога ўваженьня да сябе ні дасюль, ні потым і нават не ўяўляла, што веды могуць так пераістачаць і лучыць, узбуджаць думкі.

Для мяне асабліва прыкметным і зразумелым было ўспрыманьне Маро, ад якога ліліся незнаёмыя і дзівосныя імпульсы. Калі наступіла

задуменьне і ў паветры бязгучна павісла агульнае пытаньне “Што рабіць адгэтуль?”, яно адказала за ўсіх:

— Упэўнена ісьці далей разам. Шляхі праклала Кано, само таго не ўсьведамляючы. Дзякуй табе, дружо! Цяпер нас мацуюць ужо не надзеі, а рэальныя магчымасьці для жыцьця. Немаўля, якое ўцелаісьціла ўсіхныя мэнтальныя намыслы, гарантавала нашае быцьцё і дазволіла нам прадоўжыцца, рухацца далей па інкарнацыйных напрамках, набываць формы існаваньня ў будучым. Як тое будзе адбывацца? — ведае адно Баго. Адцяпер нам дапамагае адзінае мысьляваньне, судуманьне. Рушма!

Ляцелі трымаючыся. Поўныя ўражаньняў, нічога вакол не заўважалі, не ўспрымалі і не абмяркоўвалі, нават таго, куды нясёмся і што наперадзе. Упершыню, не зматляючыся, даверыліся адно аднаму і ўнутранаму перакананьню, што ўсё будзе добра. Ніхто не кіраваў, хоць я і лавіла на сабе позіркі ды думкі кунпаноў.

# 36

Калі мы паўсталі перад Юнто, яно сьпярша ўзрадавалася, а потым, абвёўшы ўсіх вачыма, зьніякавела.

— А дзіця? — запытала роспачна і панікла.

— Няма?! — таксама разгубілася я, гледзячы на ложа.

Памяшканьне запоўніла маўклівае задзівеньне.

— Што адбылося? — Маро парушыла яго і ўсхвалявана захадзіла, гледзячы на вокны.

— Вось менавіта! — устурбаваньне Юнто набывала панічныя ноткі.

Становішча рабілася незразумелым і выняітковым.

Усе знаходзіліся ў замяшаньні і вярцелі галовамі. Тое адзінае, што лучыла, пакрысе выпаралася.

— Спыніцеся! — гучна заклікала я. — Мы гаршэем і забруджваем! Калі гэтае, — і паказала на прыкметныя густыя вылучэньні над нашымі галовамі, якія пакрысе зьбіраліся ў цёмныя аблокі, — так матэрыялізуецца і заўважаюць усе, тады наўзапраўдзь здараецца штосьці надзвычайнае. Давайце разьбірацца — што?

— Дакладна, такія зьявы, — і Маро таксама падняло вочы ўгору, — сьведчаць, што мы пэўна выпалі з індывідуальнага ў агульнае рэчышча, то-бок сталі раўнапраўнымі ўдзельнікамі больш высокага стацьця.

— Значыць, тут, дзе мы знаходзімся, — меркаваньне Анто, як заўсёды, тычылася галоўнага, — уладарыць калі не наўмянальнае, дык інакшае, вельмі моцнае энэргетычнае поле.

Калё і Юсо пераглянуліся, павесялелі, загарэліся, і над імі ўзьніклі радульныя паскі. Над астатнімі трапяталі палоскі колераў, характэрных для глыбокага ўдумленьня. “Ад асабістага нікуды не адыдзеш”, — падумала я і чамусьці ўсьміхнулася.

— А Кано ўжо сьмяецца, задаволенае! — іранічна заўважыла Маро. — Правільна, дружо, нарэшце скончыліся надакучлівыя выпрабаваньні, і ўсе назолы пакінулі тваё сьвецьце. Можна лёгка і ўздыхнуць.

— Толькі яму, дый то не надоўга, — выказваньне Анто азначала нейкія перамены.

Усе слухалі, дападаючы, стараліся ўнікаць, канцэнтраваліся і зноўку зьбіраліся да агульнага. Флюіды са стракатых пакрыху зьмяняліся на спакойныя, блакітныя.

— Так мы хутка дабярэмася да касмасовых фарбаў і гукаў, — трохі насьмешліва заўважыла Маро.

— І ўсё-такі, дзе немаўля? — засмучона і ўнурана прамовіла Юнто.

Раптоўна загучалі этэрныя каналы. Усе скалануліся і насьцярожыліся.

Сьпярша пачулася голскае дзіцячае крычаньне, а затым — прыемнае і мяккае гаварэньне.

“Прывітаньне, спадарства! Вашае хваляваньне зразумелае. Яно ідзе ад няведаньня. Вы паводзіце сябе, як звычайныя аніманы: рэагуеце адпаведна

арганічнага ўспрыманьня і эмацыйнага паланеньня, не ўключаючы разуменьня. Вы знаходзіцеся ў высокім сыстэмным асяродзьдзі, на якое раней згадзілася Юнто. Тутэйшыя працэсы маюць выключна мэнтальнае суправаджэньне і амаль ня ўлічваюць фізычна-сэнсуальных выяўленьняў. Мы ажыцьцяўляем комплекснае разумова-псыхічнае запамажэньне, прычыняемся да сьведамасных функцыяў, заахвочваем разьвіцьцё новых і арыгінальных мысьлявых кшталтаў. Задачы абумоўліваюць нашае жорсткае і бязьлітаснае стаўленьне да кандыдатаў: застаюцца толькі тыя, хто максымальна адпавядае прагрэсіўным касмасовым патрабаваньням. Юнто здолела пераканаць нас, і мы пагадзіліся на захаваньне некаторых яе інкарнацыйных варыянтаў, дапусьцілі іх да новага выпрабаваньня. Аб дзіцяці не турбуйцеся. Яно праходзіць інкубацыйнае афармленьне і вельмі добра адаптуецца. Дарэчы, пра гэта маглі б і ведаць. Жадаем посьпехаў!”

Усе ўважліва, нават пакорна, слухалі, разумелі і ніякіх пытаньняў не задавалі. Напрыканцы павярнуліся да Юнто — і хвалі небывалага стаўленьня лінулі да яго. Значыцца, тутака вызначаліся лёсы і адсюль ішлі пэртурбацыі, якія перажывалі. Яно кіравала?!

— Часткова, — мовіла Юнто, заспакоенае ад учасьця кіравецтва ў выхаваньні немаў-

ляці і таму гатовае да стасункаў. — Кано да гэтага збольшага прыладзілася. Мы абмяркоўвалі, так?

Я, безумоўна, інакш успрыняло паведамленьне: дзівам яно для мяне ня стала, — таму пацьвердзіла, заўважыўшы своеасаблівыя вылучэньні Маро і Анто. Але нутро клыгтала: чаго чакаць?

— У такіх выпадках, — працягвала Юнто, аглядаючы зьверхняе, — кажуць банальна: усё залежыць ад нас саміх.

— Абагульняючы нявыказанае і хвалюючае, — меркаваньне Анто было рашучае, бесьпярэчнае і зьявілася пасьля сузіраньня флюідаў, — высновы: трэба мазгаваць — і не абстрактна, а дастасоўна да абставінаў.

— І так, каб нас лучыла, — дадало Маро.

— А кагосьці зьнішчыла, — такое ўдакладненьне Калё разанула і ўзрушыла, адкрыўшы трагічнае гучаньне падзеяў.

— Як баліць ад такіх забаваў! — уздыхнула Юсо, выразіўшы засмучэньне абодвух.

Апошнія рэінкарнанты моўчкі абняліся, схілілі галовы і сьцішыліся.

Чэмерна зрабілася на сэрцы. Ахапіла бедаваньне: няўжо так наканавана і любыя ўвасабленцы павінныя зьнікаць? Ці можна пазьбегнуць?

— Нельга, — цьвёрда адказала Юнто. — Такое касмасовае правіла. Калі б мы яго добра ведалі

і задумаліся, тады б не журыліся, а, наадварот, радаваліся.

— Сапраўды, — павесялеўшы, я выкінула шмат лёсых і ласкавых промняў. — Кіраўнікі нездарма выцягнулі Калё і Юсо з блытанага гольля быцьця. Тут штосьці ёсьць. Нам трэба гэта асэнсаваць і шукаць выйсьце.

— Правільна, паглядзьма не ад сябе, а ад Баго, — словы Маро паклікалі да ўзвышэньня.

# 37

Усе ажывіліся, пажвавелі.

Душы страпянуліся, узброіліся ўдуменьнем і разам паімчалі да зораў. Толькі ня дзеля правольнага вандраваньня, а для пошукаў і набыцьця новых ведаў, то-бок мэтанакіравана — да мэнтальных вышыняў.

Усё рэчыўнае атачэньне, будынкі, сядзібы, пасяленьне пачалі аддаляцца, разрэджвацца, расьцякацца, ператвараючыся ў мноства іскрыстых, разнабарвістых, мілагучных часьцінкаў, якія сумяціліся, гуляліся, весяліліся. Іства кожнага вібравала, квелілася, кунежылася і таксама праіснчвалася, набываючы спачатку аморфныя, цеклыя, а затым дымавата-туманныя, празрыстыя формы. У нейкае імгненьне сілы ўнутранага прыцягненьня саслаблі, сутнасныя зьвязі разарваліся, і мы пачалі разь-

бягацца на зыркія гульлівыя і імклівыя драбкі, зусім не адрозьніваючы адно аднаго і не спазнаючы ўласных квантаў. Усё зьмяшалася і паплыло адным зіготкім ручвом, аж пакуль не ўлілося ў гіганцкае энэргетычнае мора, дзе ўладарылі думкі. Яно лашчыла, асалоджвала, здавольвала, а праз колькі часо нанава разьмяркоўвала, групавала і наладоўвала, адпраўляючы гатовых ды шчасьлівых у іншае бліскацелае лагво.

...Ачуліся ў ранейшым памяшканьні і разгубіліся.

Нас было двое: я і Юнто. А дзе астатнія? Куды падзеліся?

Забірала ўдумленьне, не пакідаючы аніякага месца для адчуваньняў, — нават гэта здавалася дзіўным: адчаго няма адпаведных перажываньняў?

“Адтаго, што вы прайшлі мэнтальнае пераражэньне”.

Гучала не этэрна, а ў галовах і, як дайшло апасьля, магло чуцца і паралельна, і эксклюзіўна. У нас было шмат пытаньняў, і мы распачалі, хвалююча, бязладна. Некаторыя заставаліся без адказаў.

— Што зь іншымі?

“Кожны атрымаў па заслугах і дасягненьнях”.

— Канкрэтна?

“...”

— Мы зь імі стрэнемся?

“Магчыма”.

— Чаму мы засталіся ўдвух?

“Думайце”.

— Нашае вяртаньне да тых самых каардынатаў не парушае касмасовыя законы?

“Не. Вас чакалі”.

— Хто?

“Дзіця і мы”.

— Аднолькава?

“…”

— Як мы сябе паводзім?

“Не таемнічайце і не гадайце. Не зафіксуем мы — убачаць звыш”.

— Хто?

“Нябёсы”.

— І Яны?

“Калі нашыя пляны рэалізуюцца бесьперашкодна і без зрываньня, тады навідавоку агульныя інтарэсы”.

— Як цяпер?

“Менавіта. Усё ідзе зладжана”.

— Часта так?

“Не”.

— Што нам рабіць?

“Жыць і мысьляваць”.

— Мэты?

“…”

Як толькі адхлынула, глыбока ўздыхнулі. Ад напружаньня, без аддыханьня стаміліся. Вырашылі адпачыць і абодва, нібы хто скамандаваў, шырока раскінуліся на ложы, задрамалі.

# 38

Прахапіліся разам, імгненьне лыпалі вачыма, а затым павярнуліся адно да аднаго і ўсьміхнуліся.

Цікавае падабенства ўсталявалася між намі: разуменьне без тлумачэньня і выкіданьня флюідаў. Засваеньне ішло хутка, нібыта для дваіх працавалі адны мазгі. Безумоўна, тое-сёе выказвалі й паказвалі, але, пераважна, тады, калі датыкаліся да чагосьці новага, незнаёмага, асабліва вонкавага напаўненьня і атачэньня. Выключэньнем было ўсё касмасовае, якое выяўлялася двума адразу і аднолькава.

І ўсё адно дзівоты набягалі, як і на ўсякае паспольнае жыцьцё.

Сярод іх надарылася перажыць своеасаблівыя адчуваньні суцэльнага ахапленьня, якія акрамя фізычнага, эмацыйнага ўзьдзеяньня моцна паўплывалі на мысьлявыя працэсы.

А пачалося ўсё ад Юнто.

— Любаценьне, — нейк узбурылася яно і пачало ірміцца.

— Што адбываецца? — усхвалявалася я, не знайшоўшы над яго адпаведных вылучэньняў.

— Мяне так хораша запаўняюць нязнаныя кшталты…

— ?

— І я здагадваюся, чые; проста чаруюць, намаўляюць…

— ?

— Нейкія істоты… Юлё… Юсо… зоры…

Я дужа ўстурбавалася і ўзялося трэсьці друхна.

Але нечакана і мяне забрала азяленьне: аднекуль у нутро забруілі вёрткія і гарэзьлівыя кванты, ад якіх зьнібела, яліла і жадалася. Цела абхапілі прыемныя дрыжыкі.

— Колькі вас… абдоймы… пацалункі… вясельле… Калё… усё маё…

— Даволі… досыць… годзе…

Казалі-шапталі мы адначасна, млеючы ад салоджаньня, ахоцьця і задавальненьня.

Сьведам'е прымала кудзебныя і кунежныя імпульсы, пераўтварала іх і ўзбагачалася, адчыняючы новыя далягляды.

У нейкае імгненьне разам з сонечнымі болкамі яно вывергнула цудоўнае ноўніцтва: мы празерылі і ясна ўбачылі нутро адно аднаго, знайшлі глыбокае адзінства і моцна абняліся.

— Мы амаль як людзі, — засьмяялася Юнто, адступіўшы ўбок.

— Не, мы лепей, — узрадавалася і загарэлася я. — Яны ад гэтага марнуюць глузды, а мы, наадварот, удасканальваем.

— І псыхічна застаемся паўнавартаснымі.

— Так, адчыненымі для Сусьвецьця і здольнымі на суладзьдзе зь ім.

“Віншуйма! Цудоўна! Прарваліся! Значыцца, можна і ад нашага асяродзьдзя, ад такога разьвіцьця! Гэтае трэба замацаваць і выпрабаваць у касмасовых умовах, каб пазьбегнуць непажаданага вяртаньня. Але фарсаваць ня будзьма. Пакуль адпачывайце”.

Мы забыліся, і нам нагадалі пра слугаваньне. Занепакоілі. Наўкола завіхурыла, аднізу ўзьняліся шэрыя парушынкі.

Моўчкі мы глядзелі ў вакно, думалі.

# 39

Знайсьці сябе і не аслабаніцца — што гэта? Запаланеньне? Не. Толькі кантраляваньне. Фізычнае, эмацыйнае, разумовае… Суцэльнае? Не! Ёсьць адно, да чаго не дабрацца і не прыладзіць путла, — духовае. Яно — Баговае і вечна недатыкальнае. Кожнае стварэньне носіць яго, але ня ведае, як выявіць, скарыстаць.

Узьнікла ўзрушэньне, якое павярнула наўспроць: стала ясьней і цямлівей. Сканцэнтраваліся і ўлавілі староньняе прытымбыцце.

Безумоўна, за намі сачылі, нас сканавалі, але, мабыць, гонячыся за вынікамі, віжавыя сыгналы масавалі так заўзята, што мы іх успрымалі. Да таго ж нашыя сынхронныя рэакцыі павялічвалі адчуваньне навакольля.

"Пракол! Зглумілі! Зганьбілі! Кантралёры заслужылі вялікае прачуханкі!" — так абуралася кіравецтва, шукаючы вінаватых. Ну і няхай, нікога не шкада! Як і сябе ў такіх варунках. Але, калі трапіліся, трэба выбірацца.

Што рабіць?

Дзе тое ратавальнае духоўнае зярнятка?

Раптоўна празерыўшы, ускрыкнулі як ачмурэлыя.

— Мы ўсё чуем і ведаем! — гучнае маўленьне было, як ніколі, дарэчы.

"…"

Пераглянуліся.

"…"

Пакруцілі галовамі больш зьдзіўлена.

"…"

Вырашылі гаварыць.

— З намі адбылося пераўтварэньне. І на сьвядомым раўненьні. Мы ўбачылі сьвецьце поблізу да наўмянальнага. Словамі і вядомымі адчуваньнямі перадаць гэтага нельга. Нам дадзена вытлумачвацца толькі між сабой. Іншыя заўсёды будуць чуць адно бяссэнсавае балбатаньне. Мы ўсьведамляем, што ад нашых

паводзінаў залежыць вельмі многае, у тым ліку плянэтарнага і касмасовага значэньня. Папярэдняе існаваньне нас навучыла і дало веды. Ніякага ліха ў душах і сэрцах яно не пакінула. Нашыя намеры выключна гуманныя і крывічэсьлівыя. А дзейнічаць мы будзьма. Просім не перашкаджаць, ня шкодзіць, а дапамагаць. Тады ўсе застануцца задаволенымі. Памятайце, што мы здольныя самастойна зьмяняць варыянты ілюзійнага, мройнага існаваньня, прадметамі якога зьяўляюцца ўсе фізычныя стварэньні, і карыстацца імі сьведама, без умяшаньня.

# 40

Рэагаваньня доўга не было.

Вынікла яно гуляньнем дзіцяці.

Мы скалануліся і зразумелі, што нас не адпусьцяць. Як жа далёка зайшло забыцьцё Вялікага Першаістага Нараджэньня Жыцьця! Цяпер колькі ні ўвасабляй, ні вучы, ні давай, ні дапамагай і ні засьцерагай — ego засланяе ўсё!

— Зь імі размаўляць дарэмна.

— Яны невінаватыя. Іх разьдзялілі і зрабілі няпамятлівымі ад стварэньня. Раструшчанае само не зьбіраецца. Яно такім уяўляе сябе заўсёды. Нанава, да маналітнага яго могуць сабраць толькі вонкавыя сілы.

— І не абы якія, а, лепей, тыя, што іх раскрышылі.

Немаўля пачало сьмяяцца.

Весела зрабілася і нам.

— А дзіцё здольнае на зьбіраньне, дый увогуле на стварэньне?

— Трэба меркаваць, што мы пайшлі не ад дзіцячага свавольства?!

— А сьпешчанае і разьбязуранае дзіцятка звычайна ня ўрымсьціць…

— І бязладзьдзя ад яго не пазьбегнуць…

— Тады толькі сілком!

— Прымусова!

Мы пераглянуліся, каб пераканацца, што рашэньне знойдзенае.

Адверху энэргетычна лінула, як быццам накрыла. Такога поля яшчэ не зазнавалі: яно ахоўвала і ўпэўнівала.

Зноў зірнулі адно на аднаго і зажмурыліся.

Загудзела, загалсчэла, абвеяла.

# 41

Адкрыўшыся, знайшлі новае асяродзьдзе: немаўля і мы.

Раней палічылі б гэта за цуда, як людзі, але цяпер успрыманьне было інакшае і вымагала нетрадыцыйнага дачыненьня. Наогул, мутакі, жывучы побач, пераналі ад хомаў шмат глупства, сама ўстой-

лівае зь якіх — няверства ў дакладнае і імгненнае ажыцьцяўленьне думкаў.А што яны рэалізуюцца адразу і да дробязяў — мы пераканаліся неаднойчы, пры гэтым зьведалі адно непахіснае правіла: калі з кімсьці мысьлюеш аднолькава альбо знаходзісься ў судуманьні — усе перашкоды адыходзяць.

Таму я і Юнто безь зьдзіўленьня, з замілаваньнем глядзелі на малога, як яно гулялася, сьмялася, і захапляліся. Нашае аднадумства і трыадзінства было бясспрэчным, празначаным і не патрабавала аніякага староньняга тлумачэньня.

І ўсё-такі нешта пабочнае ёкнула, нагадваючы і засьцерагаючы.

Мы схамянуліся і схіліліся над сэрцайкам. Узялі яго, прытуліліся — і зноўку акрыліся лагодным і жыцьцядайным марывам.

Нас павабіла ўвысь, да свайго сьвецьця.

Сьведам'е адзначала зьмены і выяўляла этапныя моманты.

За мройнымі межаміназіралася ашалелае і злоснае мітусеньне каляністаў, якія выраблялі немаведама што і душыліся ад сваіх жа чорных і смуродных вывяржэньняў. Збудаваньні выштурхвалі ўгору іскрыстыя стужкі, адны зь якіх хутка ніклі, другія тармазіліся і падалі ўніз, спрычыняючы бедзтва. Усё суправаджалася нудным і моташным гудзеньнем, якое, здавалася, ішло ад самога пекла.

Акружэньне мільгацела і, дагаджаючы нутру, пакрысе адводзіла ад няўдалага і няўдумнага, набліжала да жаданых і прывабных мясьцінаў, дзе нас чакалі, радавалі й багомілі.

Сярод мноства пранізьлівых энэргіяў мы ўлоўлівалі і прымалі менавіта свае, пранікаліся імі й выпраменьвалі абагачаныя. Іство насычалася, трымцела і палымнела: каноднае спраўджвалася!

*Жнівень—сьнежань 2017 году, г. Менск*

# Альфабэтны тлумачальны паказьнік словаў

## А

**Аблуд** — аблуднасьць, памылка
**абноўнік** — абноўшчык
**аб’явеньне** — адкрыцьцё, аб’ява, аб’яўленьне
**адвалочны** — адцягнены
**адзабыль, адзабаль, адзабылі** — насамрэч, сапраўды
**адзіноства** — адзінства, еднасьць
**аднова** — абноўленьне, адноўленьне, аднаўленьне
**адражняцца** — адрозьнівацца
**адростак** — адросьце, атожылак, гучок, галіна
**адэпт** — чалавек, азнаёмлены з тайнамі якога-небудзь вучэньня, пасьлядоўнік якога-небудзь вучэньня
**азяленьне** — стан, падобны да ап’яненьня
**аніман** (ад лац. *animans*) — жывая істота з розумам
**асланяць** — засланяць, абараняць, заскрываць, берагчы
**астоя** — аснова, апірышча
**атайбавацца** — агнездавацца, атабарыцца
**атаропець** — збаяцца
**атхланьне** — атхлан, кароткае палягчэньне ад цяжкай працы

**ахоцьце** — ахвота, жаданьне, жарсьць, здавальненьне
**ачавісты** — відавочны
**ачколечы** — канечне, вядома
**ачхненьне** — просып, абуджэньне
**ашчырваць** — дбаць, рабіць шчырым

## Б

**Бабылства** — зборня бабылёў, стан бабыля
**багавейлівасьць** — пабожнасьць, пакорлівасьць
**Баго, Яно** — Бог, Ён
**багоміць** — абагаўляць, лічыць божышчам
**безразрожліва** — абыякава
**болагі** — добры, неблагі
**болка, балачына, балачынка, болачка** — хмара, хмарка, воблака, воблачка
**болачна, боласна** — шэра, воблачна, пахмурна
**безжурлівы** — безжурботны
**бязмысны** — бяздумны

## В

**Вакабуляр** (стараж.) — слоўнік; слоўніцтва
**валваваньне** — хваляваньне
**валшвец** — вяшчун, вешчбіт, варажбіт
**вашае высокаснае** (тытул) — вашая вялікасьць, вашая велячэсьлівасьць
**велягурны** — велічны, велізарны
**велячэсьлівасьць** — высокасьць
**ветны** — прарочы, вешчы
**відомы** — відзебны, бачны
**відзебна** — бачна
**вужлак** — пазванок, хрыбетка

**вужлаковы** — хрыбетны

**вуземка** — ячэйка, вочка, ячка

**выдыганьне** — тут: паклон, пашанотнае прысяданьне, прывецьь, дыгі, рэвэранс

**вызрынаць** — выкідаць, вызрыгаць

**вызьвярнуць** — перакруціць, сказіць, выпачыць

**выракчоны** — асуджаны, аддадзены, прызначаны, ахвяраваны

**выселак** (мн. высілкі) — калёнія, асада

**вядзьмо** — вядзьмак, знахар, чараўнік

**вярутнасьць** — сутнасьць (як ірэальнае стварэньне)

**вярэі** — вароты

**вятрут** (ветругі) — парус, ветразь, вятрыла, сьцяжок, жагель, лаштыр

## Г

**Гаварыць на вей (узьвей) вецер** — пускаць словы на вецер, дарма

**галамень** — голае месца дрэва ад каранёў да гальля

**галсчэньне** — зьява рэзанансу

**галсчэць** — выражаць гукам паднятым, разгалосным, рэзанансным

**гальмо** — тормаз

**ганодаць** — псаваць, нядбайна зьнішчаць

**гаршэньне** — разбэшчаньне, псута, скакуса

**гаршэць** — рабіцца горшым маральна

**глумна** — бязглузда, неабдумана, шкодна

**голскі** — разгалосы, этэрны згук

**гузно, гузна** — азадак, задніца

**гулявізна** — вясёлая кабета, якая любіць сьпяваць і танцаваць

**гурны** — горды, ганарлівы

# Д

**Дабратлівы** — дабрадушны, дабрасэрды
**дападаць** — даходзіць да ўсяго, унікаць
**дасьведчаньне** — тут: досьвед, практыка
**двухплоцевы** — двухполы, двухродавы
**дзеваваць** — хадзіць ў дзеўках
**доньне** — дно
**друхно** — друг, друхна
**духі заццяць** — стаіць, перапыніць дыханьне

# Ж

**Жарчысты** — палкі, гарачны
**жыватроплівы** — поўны жыцьцёвай энэргіі
**жытло** — месцазнаходжаньне, дом, сяліба

# З

**Завада** — перашкода, замінаньне, запінаньне, замін
**задзівеньне** — зьдзіўленьне, неўразуменьне
**за-любкі** — зь любоўю, з радасьцю, з задавальненьнем
**запаланеньне** — паланеньне, навала, напад, нахлынь
**запамажэньне** — спамаганьне, дапамога, падтрымка
**запамкі** — забыцьцё, забудзь, забудкі, непрытомнасьць
**засаромленьне** — сарамлівасьць, зьбянтэжанасьць
**заскрыць** — засланіць, абараніць
**зашпунтаваць** — закаркоўваць, каркаваць
**здаволеньне** — прыемнасьць, уцеха
**зданьне** — меркаваньне, погляд, паняцьце, сподумка
**земеньне** — тоўшча зямлі
**зерыць** — глядзець, узірацца
**зеціць** — глядзець, унікаючы ў сутнасьць зьявы, рэчы, сузіраць

**знаўство** — дасьведчанасьць, практычнасьць

**зубожаньне** — згаленьне, заняпад, зьмяншэньне, высіленьне

**зысьціцца** — ажыцьцявіцца

**зьлічво** — лічэньне

**зьмесьлівы** — сумяшчальны

**зьміраць** — выміраць

**зьнібець** — сардэчна зьнемагаць, мучыцца, быць у зьнібе

# І

**Ірміцца** — гарэць, загарэцца якімсьці почавам, чуцьцём

**іставетна** — сапраўды, істотна, наўзапраўдзь

**істы, істая, істае** — праўдзівы(-ая, -ае), сапраўдны(-ая, -ае), сутнасны(-ая, -ае)

# К

**Калавацець, калянець** — рабіцца цьвёрда-пруткім, незгінальным, нягнуткім, нязломным, жорсткім, дзервянець, пруцянець, шэрхнуць, дранцьвець, лубянець, грубець навобмацак

**калярысты** — пярэсты, яркі, яскравы

**канодны** — які адпавядае кону, суджанаму

**канчар** — канчак, канечнасьць, канцавіна і г. д.

**капорсаць** — кешкаць, кішэць, варушыць, пыркацца

**карно** — прыстасаваньне пры кіраваньні стырном у вадаплаве

**карэкі, арыі** (арыё, н. р.), **адаміты** (адаміта, н. р.), **хома** (ад *homo sapiens*) — касьмічнае найменьне людзей, жыхароў Вялікай Пятай карэннай зямной расы

**касмасо, касмасовы** — космас, касьмічны

**кваліцца** — цьваліцца, ятрыцца, раздражняцца

**клыгтаць** — клекатаць

**кляпцы** — запастка, зашчымка, пастка

**кудзебны** — чароўны

**кунега, сунега** — тут: стан асалоды і ўнутранага задавальненьня

**кунежыць** — лашчыць, цешыць

**кунежлівы** — пяшчотны, жарсны, задаволены

**кунежны** — які выяўляе любоў, дае насалоду, пяшчотны

**кунпан** — злучаны з кім дружбай, такі самы, роўны

**купрык** — купрэц, хвасьцец (аканечнік хрыбетніцы ў чалавека)

**кутнік** — які жыве ў адным пакоі

## Л

**Лагво** — логава

**лёсы** — цудоўны

**літаньне** — малітва аб заступніцтве

**лохатны** — маўклівы, у самім сабе сьмех

**любаценьне** — асалода, прыемнасьць найвышэйшага кшталту

**любаярлівасьць** — схільнасьць да плоцевых уцехаў

**людзкавацца** — быць сярод добрых людзей, у прыстойным атачэньні

## М

**Манада** — першасная, непадзельная, бесьсьмяротная духоўная адзінка

**меньне** — маёмасьць

**месьціва** — месцапалажэньне, месцазнаходжаньне

**модус** (лац. *modus*) — вобраз

**мэнтал** (ад лац. *mentalis*) — разумны, духоўны

**мярэсьціцца** — мітурыцца, здавацца, блюзьніць

# Н

**Набрузнуць** — набракнуць, раздацца ад прыліву сокаў
**назвоч** — назвочна, навідавоку, увачавідкі
**назьне** — звонку
**намянаць** — намякаць
**намяненьне** — намёк, прымёк, намінка
**нарочыта** — спэцыяльна, адмыслова
**наскі** — наш
**насторшыцца** — натапырыцца, ашчацініцца
**наўзацмак, наўзацмачкі** — узасос
**наўпроць** — супроць, супраць
**нашчадзтва** — нашчадзь, спадкаемства
**непадумліва** — неверагодна (нават нельга падумаць)
**ноўніцтва** — навіна, новаўвядзеньне
**ноўца** — нэафіт, навічок, ноўчык
**няўметліваньне** — неўразуменьне, няўцямлівасьць, няўпамлівасьць

# П

**Пазорны** — прыгожы, цудоўны, зграбны
**пакліканьне** — здатнасьць, прызначэньне, заклік
**палацьвіць** — палегчыць, аблегчыць
**палашыць** — бударажыць, трывожыць, непакоіць
**паспольны** — сумесны
**патварaць** — упадабняцца камусьці
**пахічаньне** — захапленьне
**пахічаць** — захапляць, зачароўваць
**параістачаць** — ператвараць, параістоціць, перакшталчаць, зьмяняць
**перакшталчаць** — зьменьваць
**перакшталчэньне** — праіснaчаньне, параістачэньне, ператварэньне

**перапона** — перашкода, загарода, запора, завала
**похап** — парыў, імпэт
**почаў** — пачуцьцё, чуцьцё, адчуваньне
**почаўны** — пачуцьцёвы
**празначаны** — асуджаны, прызначаны
**празнусьціць** — ашукаць, абдурыць, перахітрыць
**празорлівы** — праніклівы, які ўмее прадбачыць, прадугадваць
**прастора і вытворныя словы** — ужываюцца ў ніякім родзе
**прасьвядны** — шчасьлівы, напоўнены Духам Божым, даруючы шчасьце
**прачуцьцё** — прадчуваньне
**прызваленьне** — пажаданьне
**прызваляць** — рабіць ласку, жадаць
**прыродзьдзе** — прырода
**прыстоіць** — выражаць прыстойнасьць
**прытымбыцьце** (гл. слоўнік В. Ластоўскага) — прысутнасьць
**прыхадзень** — прышлец, чужак, чужаніца, прыблуда, захадзень
**прыяцеля** (н. р.) — прыяцель, прыяцелька
**путло** — путо

# Р

**Радульны** — вясёлкавы, радужны, вясёлісты разо — раз
**разьбязураны** — расьпешчаны, спатвораны, якому патураюць
**распрыжаць** — разрадзіць, разладаваць
**расьцячацца** — растварацца, распушчацца, расшчапляцца
**ручво** — лагво, рэчышча

# С

**Сабетніцтва** — эгаізм

**сазгучны** — сугучны

**сазгучча** — созгук, сугучча

**самаісты** — самастойны

**сарамацьце** — сорамныя, ганебныя, непрыстойныя паводзіны

**свомы** — уласьцівы

**собскі** — уласны, свой

**спагвезьдзе** — сузор'е

**спагляньне** — узрок, зрок, пагляд

**спадкавы** — спадчынны

**спадумлівы** — памысьлівы, надумлівы

**спазор** — вонкавы выгляд, спаверхнасьць, краявід, панарама, частка прыроды

**спамочаньне** — дапамога

**спаталыжыцца** — асалапець, разгубіцца

**спаталыжыць** — агаломшыць, ашаламіць

**спахоўны** — захаваны, падспудны

**спацямлівы** — цямлівы

**спацямна** — зразумела

**сподумка** — спадумлівасьць, надумлівасьць, асьцярожнасьць у думках

**спохватка** — манера

**спрыяя** (н. р.) — спрыяйнік, прыяцель

**стайкавацца** — здружыцца на ўзроўні блізкасьці

**станавіцца** — зьяўляцца, будавацца, рабіцца, адбывацца

**станьком** — у становішчы "стойма"

**станьнё, стацьцё** — здарэньне, падзея

**стоўпішча** — ёмішча, умяшчальня, стоўплішча
**стрыкаць** — джгаць, жыгаць
**студзень** — дрыгнік, дрыгністы; квашаніна
**студзяністы** — халадцападобны і празрысты
**сугасподнікі** — разам наймаюць адну гасподу (кватэру)
**судошаньне** — сустрэча, спатканьне
**сужэнства** — шлюб
**сукоіцца** — супакоіцца
**сукрыцьце** — скрыткі, сховы, няшчырасьць
**суладзьдзе** — гармонія
**сусьвецьце** — сусьвет
**сутарна** — сумятліва, сьпешна
**сутарны** — мітусьлівы
**сьвецьце** — сьвет
**сьлічны** — прыгожы
**сьмеў** — сьмех, сьмешкі, сьмяхоты
**сьмялач** — сьмяльчак
**сьмяроцьце** — сьмерць
**сьпятрэць** — высахнуць, схуднець
**сябро** — сябра, сяброўка

# Т

**Таварыша** (н. р.) — таварыш, таварышка
**тайко** — тайнік, тайка
**тарнаваць** — турбаваць, хваляваць
**таўпарня** — валтузьня, важганіна, важданіна, саўганіна, цяганіна, амбарас
**трываньне** — знаходжаньне, цярпеньне
**турзаньне** — пакута
**тхненьне** — подых, подзьмух

## У

**Угамаваць** — уціхамірыць, заспакоіць, утаймаваць
**угледзіны** — агляд маладой
**удаваны** — напускны, штучны
**узбураньне** — узбуджэньне, пабудка
**умецтва** — здольнасьць
**уродны** — станісты, ладны, гожы
**уроеньне** — уваброжэньне, уяўленьне
**уставічна** — няўстанна
**устройства** — арганізацыя
**устхненьне** — уздыханьне, уздых
**уцелаішчаны** — увасоблены ў матэрыі
**уцяжлівы** — цяжкі, моташны, цяготны

## Ф

**Філямэнты** (лац. *filament* 'нітка') — унутрыклеткавыя цытаплязматычныя ніткападобныя бялковыя структуры

## Х

**Хаморыцца** — туманіцца
**харужы** — сараматныя часткі цела
**хвосьце** (н. р.) — хвост
**хвосьцейка** (н. р.) — хвосьцік
**хомар** — туман, смуга, імгла
**хрыбетнікі** — пазванковыя жывёлы

## Ц

**Цопаць** — падаваць назад, пазадзіць
**цопнуцца** — адступіць, пазадзіць
**цубур** — сьцябло

## Ч

**Чапорыцца** — харахорыцца, бадзёрыцца
**часо** — час
**чуняць** — ня спаць
**чэмерна** — горкасна

## Щ

**Шлуньне** — унутранасьці, вантробы
**шчыраць** — намагацца, дбаць, завіхацца

## Я

**Ягліцца** — гарэць жаданьнем, жарсна жадаць
**яліць, заяліць** — нясьцерпна, жарсна жадаць

*Літаратурна-мастацкае выданне*

**Калядны** Мікола

# СУДУМАНЬНЕ

*Аповесць*

Адказны за выпуск *Зміцер Вішнёў*
Дызайн вокладкі *Павел Дарохін*
Рэдактар *Віктар Жыбуль*
Вёрстка *Дар'я Пушкар*
Карэктар *Ліда Наліўка*

Падпісана да друку 05.09.2018. Фармат 70×90/32.
Папера афсетная. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 4,83. Ул.-выд. арк. 3,42.
Наклад 300 асоб. Замова 2775.

16+

Прыватнае выдавецкае ўнітарнае прадпрыемства "Галіяфы".
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/48 ад 03.10.2013.
Пр. Партызанскі, 77А, 220107, Мінск.
E-mail: vish@bk.ru
www.halijafy.by

ТДА "НоваПрынт".
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/54 ад 25.02.2014.
Вул. Геалагічная, 59, корп. 4, каб. 10, 220138, Мінск.

**Homo sapiens, ці карэкі (па-іншаму: арыі, адаміты, хомы), былі нашымі папярэднікамі. Асноўныя інкарнацыйныя якасьці яны разьвілі ў Вялікім Пятым Увасабленьні, а ў нашае, Шостае, перайшлі, каб, згодна з кармічнымі законамі, даастатку перажыць дадзенае і ачысьціцца, займець годнае духовае зьмесьціва для нараджэньня ў наступных касмасовых Кругах. Як і ўсякае стварэньне перад выміраньнем нудзіцца, сьмярдзіць і дакучае, людзі ўжо даўно нурацца, гаршэюць, усё ганодаюць ды патрабуюць залішняга абыходжаньня.**



ISBN 978-985-7140-95-4

9 789857 140954

ВЫДАВЕЦТВА ГАЛІЯФЫ

МІКОЛА КАЛЯДНЫ

СУДУМАНЬНЕ